наша свабода


№68 ВЫДАЕЦЦА З 25 ЛЮТАГА 2000 ГОДА

20 КАСТРЫЧНІКА 2000 года ПЯТНІЦА

Адрас: 220123, г.Мінск, а/я 103

E-mail: NPSvaboda@irex.minsk.by http://www.svaboda.com

КОШТ СВАБОДНЫ




# Выбары сфальсіфікаваныя!

Аляксей ШЫДЛОЎСКІ

**Рэспубліканскі цэнтральны каардынацыйны савет па падрыхтоўцы назіральнікаў за правядзеннем выбараў абнародаваў інфармацыю, з якой вынікае – выбары ў палату 15 кастрычніка не адбыліся, а іхнія вынікі былі сфальсіфікаваныя.**



Старшыня РЦКСПН Мечыслаў Грыб паведаміў, што пры дапамозе кансультатыўна-назіральнай групы АБСЕ ва ўсіх рэгіёнах Беларусі за выбарамі ў якасці назіральнікаў сачылі 5.574 чалавекі. Гэта дазволіла ахапіць больш за трэць усіх выбарчых участкаў краіны.

Шмат дзе назіральнікам заміналі наглядаць за выбарамі, не давалі кантраляваць падлік галасоў – нягледзячы на тое, што яны маюць на гэта права паводле новага Выбарчага кодэкса. Назіранне адбывалася не толькі ў дзень галасавання, а на працягу ўсяго выбарчага працэсу, улічваючы дні датэрмінова га галасавання.

Па словах М.Грыба, лічбы, названыя старшынёй Цэнтрвыбаркама Лідзіяй Ярмошынай, яўна замоўленыя ўладай, бо істотна разыходзяцца з дадзенымі, што паведамілі назіральнікі. Нагадаем, дарэчы, што Лідзія Ярмошына ў 1996 годзе была ў парушэнне закона прызначаная на пасаду кіраўніка Цэнтрвыбаркама асабіста Аляксандрам Лукашэнкам.

Насуперак заявам ЦВК, не адбыліся выбары ні ў адной акрузе такіх буйных гарадоў, як Салігорск, Наваполацк, Рагачоў, Полацк, Орша, Магілёў, Бабруйск, Брэст, Віцебск, Мінск. Ва ўсіх гэтых гарадах вынікі выбараў ужо апратэставаныя.

Усяго ж на выбары прыйшло, паводле падлікаў каардынацыйнага савета, не больш за 41% выбаршчыкаў. У буйных гарадах яўка выбаршчыкаў была яшчэ меншай – ад 35% да 38,5%. Як вядома, пасля доўгіх падлікаў улады абвясцілі зусім іншую лічбу – 60,6%.

Толькі ў Мінску у 94-й, 95-й, 99-й, 100-й, 104-й, 109-й і 110-й выбарчых акругах прагаласавала ад 34% да 46,7%, аднак на наступны дзень улады абвясцілі, што выбары адбыліся.

Як заўсёды ў апошнія гады, улады надалі шмат увагі прапагандзе датэрміновага галасавання. Бо нішто так не дапамагае прасунуць патрэбнага кандыдата, як датэрміновае галасаванне, – і пракантраляваць яго куды цяжэй, і любыя фальсіфікацыі тут магчымыя.

У Віцебску ў акрузе №19, што месціцца на тэрыторыі вайсковай часткі, датэрмінова прагаласавалі 69% выбаршчыкаў у форме. Цікава, куды ж яны мусілі збегчы са сваіх казармаў у дзень галасавання, што ім так карціла прагаласаваць раней?

У Гродне на тонкасуконным камбінаце працэнт папярэдняга галасавання склаў больш за 20%, а ўвогуле па Гродзенскай вобласці – крыху больш за 15%.

У Жлобіне звычайныя тэрміны паляўнічага сезона былі перанесеныя на тыдзень з той мэтай, каб прыкладна 1.500 паляўнічых, якія ёсць у тым рэгіёне, не зніклі ў дзень правядзення выбараў.

Але больш за ўсё, па інфармацыі каардынацыйнага цэнтра, падтасоўкі ішлі шляхам выкрэслівання людзей са спісаў выбаршчыкаў, каб падвысіць такім чынам агульны працэнт. Людзі выкрэсліваліся сотнямі, а назіральнікі атрымлівалі тлумачэнні, што за апошнія некалькі дзён усе тыя людзі некуды пераехалі або проста памерлі. У выніку некаторыя «нябожчыкі», якія ўсё ж з'явіліся на ўчастках перад самым закрыццём, бачылі сябе выкрэсленымі са спісаў.

Красамоўны прыклад – 99-ая Ясенінская акруга Мінска (Маскоўскі раён), дзе назіральнікі фіксавалі парушэнні на ўсіх участках. Самай буйной падтасоўкай тут можна лічыць тое, што колькасць прагаласаваўшых на ўчастках была штучна падвышаная з 44,53% да 53,4%. У выніку было паведамлена, што выбары па гэтай акрузе адбыліся.

Па сведчаннях назіральнікаў, калі вядучы праграмы «Рэзананс» паведаміў пасля заканчэння галасавання, што выбары па ўсім Мінску не адбыліся, старшыні выбарчых участкаў з лёгкім сэрцам сталі падпісваць копіі пратаколаў, згодна з якімі агульная колькасць прагаласаваўшых склала 44,53%. І толькі пазней, відаць, атрымаўшы жорсткія ўказанні зверху, лічбы раптоўна пачалі змяняцца ў бок павелічэння і ўрэшце дайшлі да 53,4%.

Прывядзем некаторыя найбольш яркія параўнанні лічбаў на ўжо падпісаных пратаколах і ранішніх лічбаў.

195-ы ўчастак — колькасць выбаршчыкаў зменшаная на 250 чалавек, колькасць прагаласаваўшых павялічаная на 320, колькасць несапраўдных бюлетэняў павялічаная на 320, разыходжанне на 18,1%.

200-ы ўчастак, адпаведныя лічбы: 250, 225 і 230, разыходжанне —15,3%.

218-ы ўчастак – колькасць выбаршчыкаў зменшаная на 69 чалавек, а колькасць прагаласаваўшых павялічаная на 840 чалавек, дзякуючы чаму разыходжанне склала ажно 35,8%.

І так амаль паўсюль. «Сумленныя» засталіся вельмі рэдкія ўчасткі, а на некаторых падпісваць першыя, вечаровыя копіі пратаколаў адмовіліся, загадзя перасцерагаючыся ад таго, каб іх злавілі за руку. І так па ўсёй краіне... Сапраўдны дзень падману беларусаў! ■

## Беларусь: выбары 15 кастрычніка былі недэмакратычныя

### Заява намесніка прэс-сакратара дзярждэпартамента ЗША Філіпа Рыкера

Злучаныя Штаты падтрымліваюць меркаванне сваіх еўрапейскіх партнёраў аб тым, што выбары 15 кастрычніка ў Беларусі не былі свабоднымі, справядлівымі і празрыстымі. Тэхнічная місія Бюро дэмакратычных інстытутаў і правоў чалавека Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ) і Еўрапейскай Парламенцкай Тройкі зрабіла выснову, што азначаныя выбары не адпавядалі міжнародным нормам дэмакратычных выбараў. Злучаныя Штаты не прымаюць вынікаў гэтых выбараў і будуць працягваць прызнаваць дэмакратычна абраны Вярхоўны Савет 13 склікання, які ўзначальвае Сямён Шарэцкі, як легітымны парламент Беларусі. Свабодныя, справядлівыя і празрыстыя выбары не вызначаюцца выключна бесперашкодным галасаваннем у дзень выбараў. Такое галасаванне — толькі частка працэсу, які складае дэмакратычныя выбары і які акрамя таго абавязкова павінен уключаць бесперашкодную перадвыбарчую кампанію са свабодным абменам думак. Нягледзячы на неаднаразовыя заклікі Злучаных Штатаў, ЕС і АБСЕ стварыць клімат, неабходны для такой кампаніі, беларуская ўлады не прадэманстравалі заўважальнага прагрэсу ў гэтым накірунку.

У дзень выбараў з'явіліся паведамленні аб шматлікіх парушэннях, якія сведчаць аб фальсіфікацыі з боку рэжыму. У парушэнне беларускага заканадаўства скрыні для галасавання дастаўляліся літаральна да дзвярэй, і грамадзян «заахвочвалі» галасаваць. Тое, што рэжым быў вымушаны пайсці на такія неардынарныя меры, сведчыць аб тым, што байкот выбараў апазіцыяй быў эфектыўны.

Злучаныя Штаты глыбока шкадуюць аб тым, што беларускія ўлады праігнаравалі жаданне ўсё большай колькасці беларускіх грамадзянаў вярнуцца да дэмакратыі і рашуча асуджаюць буйныя парушэнні, дапушчаныя рэжымам Лукашэнкі падчас выбараў. Прэзідэнцкія выбары, запланаваныя на наступны год, павінны прайсці без такіх парушэнняў, інакш яны таксама могуць не атрымаць прызнання міжнароднай супольнасці. ■

Вашынгтон, 16 кастрычніка 2000 г.

## ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ


■ **Незвычайны сёлета на Магілёўшчыне ўраджай бульбы (200 цэнтнераў з гектара) можа прапасці з-за безгаспадарчасці.** Паколькі гандляваць праз самыя розныя інструкцыі нявыгадна, яе проста скідаюць у сховішчы. Калгасныя кіраўнікі кажуць, што, калі бульба не згніе, то будзе за бясцэнак аддадзеная дзяржаве.

■ **Жыхары Берасцейскай вобласці абураныя 8-разовым падвышэннем коштаў на камунальныя паслугі.** Такі нечаканы падарунак зрабіў ім на 100 дзён знаходжання на пасадзе старшыні тутэйшага аблвыканкама колішні віцэ-прэм'ер ВасільДалгалёў. Людзі нязгодныя з такім спосабам папаўнення пустога абласнога бюджэту і масава пішуць скаргі. Яны скардзяцца не толькі на шокавае павелічэнне камунальных тарыфаў, але і на нізкую тэмпературу гарачай вады ў кватэрах, нарэшце, на частую яе адсутнасць.

■ **У Мінску прайшоў 10 з'езд Саюза журналістаў, на якім інфармацыйны абслугачы дзяржаўнай палітыкі пераабралі старшынём Леаніда Екеля.** Зараз у арганізацыю ўваходзіць блізу 2,5 тысячаў членаў, тады як яшчэ 7 гадоў таму іх было ўдвая болей: проста старыя паміраюць, а маладыя не жадаюць туды ўступаць. Але гэта дэлегатаў з'езда не дужа турбавала. Галоўнае для іх — заставацца, як сказаў у сваёй прамове старшыня Беларускага радыё Уладзімір Ядранцаў, «найпершымі памочнікамі кіраўніцтва нашай дзяржавы».

■ **Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Міхаіл Дражын пайшоў у адстаўку.** Пасля паўтарагадовага знаходжання на гэтай пасадзе ён матываваў сваё рашэнне станам здароўя і нервальнымі вымогамі лукашэнкаўскага ўрада да сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна. Зараз абавязкі галоўнага «вертыкальшчыка» Магілёўшчыны выконвае першы намеснік Дражына Зміцер Сівіцкі, які ў свой час быў дырэктарам бабруйскай аўтабазы і некалькі разоў ачольваў Магілёўскі гарвыканкам. Ці стане в.а. Сівіцкі старшынём, залежыць ад таго, якую яўку на Магілёўшчыне ён забяспечыць у другім туры выбараў.

## НАДВОР'Е






Курс наяўнага долара на «чорным рынку» 1065

# Часовы ўрад Сямёна Шарэцкага

Рыгор БУЯН

Старшыня Вярхоўнага Савета 13-га склікання Сямён Шарэцкі, які гэтым жніўнем адзначыў гадавіну палітычнай эміграцыі ў Вільні, агучыў ініцыятыву стварэння Часовага ўрада нацыянальнага даверу.

Неабходнасць стварэння Часовага ўрада спікер у распаўсюджанай 17 кастрычніка заяве абгрунтаваў тым, што першы тур выбараў у палату прадстаўнікоў стаў «першым актам сацыяльнай трагікамедыі», і «так званыя выбары не могуць лічыцца легітымнымі з самага пачатку».

«Галасаванне паказала, што дыктатарскі рэжым ужо не мае падтрымкі народа, які, будучы маральна прыніжаным і давядзеным да галечы, па сутнасці праігнараваў так званыя выбары, нягледзячы на падман, подкуп і пагрозы з боку дыктатарскага рэжыму», — заявіў Сямён Шарэцкі.

Выйсце з гэтага становішча С.Шарэцкі бачыць у адным – «Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, як адзіны легітымны заканадаўчы і вышэйшы прадстаўнічы ў краіне орган, што зноў пацвердзілі прадстаўнікі міжнародных арганізацыяў, павінен неадкладна прыступіць да фарміравання Часовага ўрада нацыянальнага даверу, які б замяніў збанкрутаваную групу асобаў, што ўтрымліваецца незаконна і працуе на ліквідацыю незалежнасці Беларусі». Сам Сямён Шарэцкі гатовы «ўзяць на сябе ўсю адказнасць і прыступіць да перамоваў з усімі зацікаўленымі сіламі за захаванне незалежнасці Беларусі і вяртанне яе на дэмакратычны шлях развіцця». ■

# Фестываль недзяржаўнай прэсы

Вольга АНЦЫПОВІЧ

17-18 лістапада ў памяшканні Палаца ветэранаў (вул.Янкі Купалы,21) адбудзецца Першы беларускі фестываль недзяржаўнай прэсы. Магчымасць яго правядзення ў Мінску арганізатары атрымалі пасля шматлікіх спробаў зняць хоць якое-небудзь памяшканне ў арэнду. Арэндадаўцы, пасля папярэдняй згоды, адмаўлялі ў апошні момант. Справа дайшла да таго, што Беларуская асацыяцыя журналістаў збіралася праводзіць фестываль у Беластоку.

Але, атрымаўшы дазвол, цяпер арганізатары ўдакладняюць праграму фестывалю. Мяркуецца, што ў ім прыме ўдзел больш пяцідзесяці недзяржаўных выданняў. Праграма прадугледжвае правядзенне выставаў газетаў, арганізацыю рэдакцыйных інфармацыйных стэндаў і сустрэчы калектываў рэдакцыяў, галоўных рэдактараў з чытачамі. ■

# За байкот – холад у кватэрах

У Віцебску 18 кастрычніка ў кватэрах грамадзянаў адключылі ацяпленне. Афіцыйная фармуліроўка камунальных службаў – папярэдняе ўключэнне ацяплення было простай праверкай. Аднак той факт, што сёлета батарэі сталі грэць у кватэрах акурат напярэдадні восеньскіх выбараў, выклікае думку пра помсту віцяблянам, якія гэтыя выбары прабайкатавалі, адключэннем цяпла. ■

# Відавочная маніпуляцыя меркаваннямі

**Бюро па Дэмакратычных інстытутах і Правах чалавека (БДІПЧ) пры Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе не можа мець дачынення да заключэння некаторых міжнародных назіральнікаў, чыімі меркаваннямі, як высветлілася, маніпулявалі.**

У адказ на заяву міністэрства замежных справаў Беларусі, якая з'явілася сёння, БДІПЧ АБСЕ адзначае наступнае:

— Каля 150 міжнародных назіральнікаў, якія не маюць дачынення да БДІПЧ АБСЕ, прыбылі большай часткай на запрашэнне беларускіх уладаў, каб назіраць за парламенцкімі выбарамі 15 кастрычніка. Яны знаходзіліся на тэрыторыі краіны толькі 4-5 дзён;

— БДІПЧ АБСЕ атрымала інфармацыю, што Цэнтральная выбарчая камісія (ЦВК) прапанавала аплаціць або аплаціла гатэльныя выдаткі для некаторых гэтых назіральнікаў;

— У дзень выбараў ЦВК наладзіла аўтобусныя экскурсіі на выбарчыя ўчасткі для некаторых назіральнікаў;

— ЦВК прапанавала назіральнікам запоўніць праверачныя анкеты БДІПЧ АБСЕ, хоць БДІПЧ АБСЕ не давала на гэта дазволу;

— Пасля заканчэння галасавання ЦВК прапанавала гэтым назіральнікам падпісаць ужо падрыхтаваную заяву, якая ўхваляла прайшоўшыя выбары, без якіх бы то ні было пацвярджаючых высноваў.

БДІПЧ АБСЕ накіравала на гэтыя выбары толькі Місію тэхнічнай ацэнкі, і ў дзень выбараў кароткатэрміновыя назіральнікі не з'яўляліся на ўчастках. Базуючыся на месячным вывучэнні працэсу, Місія па тэхнічным вывучэнні выпрацавала дакладныя і падмацаваныя дакументамі высновы, якія былі апублікаваныя 16 кастрычніка ў Заяве аб папярэдніх высновах і заключэннях. ■

**17 кастрычніка 2000 г.**
**Варшава**
**Пераклад неафіцыйны**

# Пуцін прыняў Лукашэнку ў Сочы

Кірэй МАНУЙЛА

**У чацвер Аляксандр Лукашэнка лятаў у Сочы на сустрэчу да расійскага прэзідэнта Уладзіміра Пуціна. Перамовы праходзілі ў тамтэйшай рэзідэнцыі «Бачароў ручай».**

Лукашэнку гэтае рандэву пасля сфальшаваных «палатачных» выбараў было патрэбнае як нервасупакойны сродак. Таму ён на самым пачатку перамоваў паспяшаў падзякаваць расійскаму прэзідэнту за лагоднае стаўленне Крамля да нядаўняй парламенцкай кампаніі. А.Лукашэнка назваў гэта «найвялікшай пазіцыяй», а У.Пуцін у сваю чаргу — як неўмяшанне ва ўнутраныя справы Беларусі.

Пагаварылі А.Лукашэнка і У.Пуцін і пра туманную будучыню інтэграцыйных працэсаў. Калі на мінулым тыдні Аляксандр Лукашэнка заявіў, што 100-тысячнае войска на тэрыторыі Беларусі бараніць і будзе бараніць надалей не сябе, а перш за ўсё «старэйшага брата», то Уладзімір Пуцін падобных шчыраванняў у адказ не робіць.

У Сочы ён прамаўляў пра другую армію. У.Пуцін сказаў, што выступае катэгарычна супраць неапраўданага раздування саюзнага апарата: «мы хацелі б пазбегнуць аднаго – росту шматлікай арміі чыноўнікаў, якія незразумела чым займаюцца».

Самі ж Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін заявілі, што ў Сочы займаліся «наладжваннем афіцыйных кантактаў», што пасля доўгіх гадоў частых «інтэграцыйных» гасцяванняў то ў Мінску, то ў Маскве прагучала як мінімум недарэчна. Напрыканцы лістапада эстафета будзе перададзеная прэм'ерам – Міхаілу Касьянаву і Уладзіміру Ярмошыну. ■

# Міліцыянты заплацяць за «беспредел»

Аляксей ШЫДЛОЎСКІ

Суд Цэнтральнага раёна г.Мінска днямі вынес рашэнне, якое можа стаць істотным прэцэдэнтам на будучыню. Разгледзеўшы скаргу грамадзянаў Генадзя Проніна і Алега Міронава аб тым, што яны незаконна пацярпелі ад дзеянняў міліцыянтаў 25 сакавіка, калі перад акцыяй «Дзень волі» супрацоўнікі МУС праводзілі масавы хапун у горадзе, суд вынес рашэнне спагнаць з МУС па пяцьдзесят тысяч рублёў на карысць кожнага пацярпеўшага.

Нагадаем, тады ў горадзе, і ў прыватнасці ў раёне плошчы Якуба Коласа, міліцыянты затрымалі каля пяцісот чалавек, у тым ліку шмат жанчын, дзяцей, журналістаў. Некаторых у райаддзелах білі.

У Проніна і Міронава атрымалася даказаць, што міліцыянты, якія іх абсалютна незаконна затрымлівалі, былі не пераапранутымі злачынцамі, як «меркавалі» прадстаўнікі МУС падчас першага паседжання суда, а цалкам рэальныя людзі. Высветлілі нават імя аднаго з іх – Юры Вахта. І суду нічога не заставалася рабіць, як прызнаць правату істцоў у дачыненні да міліцыянтаў.

Цікава, а калі б усе незаконна затрыманыя 25 сакавіка, усе пяцьсот чалавек, падалі скаргі, як бы МУС выплачваў такую «круглую капеечку» пацярпелым? Але затое гэта стала б для іх добрым урокам. ■

# Аб'яўленая вайна

## Беларускі дэпутат супраць Генадзя Селязнёва

Рыгор БУЯН

Скандал паміж дэпутатам Вярхоўнага Савета 13-га склікання Уладзімірам Нісцюком і старшынёй Дзяржаўнай Думы Расіі Генадзем Селязнёвым пагражае перарасці на міжнародны ўзровень. На лукашэнкавам з'ездзе саветаў 29 верасня высокапастаўлены расіянін дазволіў сабе абразу на адрас беларускага калегі: «Расійскай дэлегацыі заўсёды бывае сорамна на тых Парламенцкіх асамблеях АБСЕ, калі аб'яўляюць і даюць слова прадстаўніку Беларусі. Выходзіць, па сутнасці, самазванец з прозвішчам Нісцюк, каторы пачынае граміць сваю краіну...». Беларускі дэпутат не вытрываў падобных абразаў і публічна заявіў намер прыцягнуць Г.Селязнёва да судовай адказнасці па месцы жыхарства апошняга – у Маскве. Кошт нанесеных маральных стратаў «самазванец» ацэньвае ў 100 тысяч долараў ЗША. Улічваючы, што Г.Селязнёў з'яўляецца яшчэ і віцэ-спікерам Парламенцкай асамблеі АБСЕ, сума іску можа быць значна павялічаная.

А тым часам скандал выйшаў за рамкі прыватнай абразы на міжнародную арэну. 12 кастрычніка Уладзімір Нісцюк перадаў прыехаўшаму ў Мінск старшыні ПА АБСЕ Адрыяну Севярыну ліст, у якім паінфармаваў яго пра намер судзіцца з Г.Селязнёвым. Справа ў тым, што «самазванцам» Уладзіміра Нісцюка ніяк не назавеш. У.Нісцюк разам з Сямёнам Шарэцкім, Анатолем Лябедзькам ды Віктарам Хомічам прадстаўляюць ВС 13-га склікання ў ПА АБСЕ нават пасля разгону парламента ў 1996 годзе ў выніку неканстытуцыйнага рэферэндуму. Парламентарыі АБСЕ адмовіліся прызнаваць палату прадстаўнікоў законным органам улады і яшчэ двойчы – 17 студзеня 1997 года ў Вене і 7 ліпеня 1998 года ў Капенгагене – пастаянны камітэт ПА АБСЕ пацвердзіў паўнамоцтвы Вярхоўнага Савета. Таму, як піша ў лісце У.Нісцюк, «я на працягу чатырох гадоў з'яўляюся членам гэтай дэлегацыі і ў адпаведнасці з правілам 3 Правілаў працэдуры ПА АБСЕ маю афіцыйны статус члена ПА АБСЕ».

Уладзімір Нісцюк нагадвае, што адной з мэтаў і задачаў ПА АБСЕ з'яўляецца аказанне падтрымкі ўмацаванню і кансалідацыі дэмакратычных інстытутаў у краінах – удзельніцах АБСЕ. Падобныя выказванні Генадзя Селязнёва ў прысутнасці 2.500 чалавек, сярод якіх былі і прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса, «уступае ў супярэчлівасць з указаным правілам і заслугоўвае негатыўнай ацэнкі Бюро і пастаяннага камітэта».

«Лічу, што дзеянні Г.Селязнёва наносяць істотны маральны ўрон АБСЕ як адной з найбольш уплывовых міжнародных арганізацыяў і несумяшчальныя з высокім званнем намесніка Старшыні ПА АБСЕ. Інфармую Вас пра свой намер распачаць збор подпісаў членаў ПА АБСЕ для ўнясення ў адпаведнасці з правілам 18 на чарговую сесію ў ліпені 2001 года ў Парыжы пытання пра вотум недаверу спадару Селязнёву», — піша У.Нісцюк. Па ягоных словах, для ўнясення гэтага пытання ў парадак дня трэба сабраць не менш за 15 подпісаў прадстаўнікоў не менш як трох краінаў. І толькі пасля таго пытанне пра недавер Генадзю Селязнёву разгледзіць адзін з трох камітэтаў ПА АБСЕ, хутчэй за ўсё, камітэт па правах чалавека і дэмакратызацыі, у якім і працуе У.Нісцюк. ■

# «Для перагляду стаўлення няма прычынаў»

**Вынікі выбараў у парламент Беларусі дэмакратычны свет можа прызнаць толькі разам з беларускай апазіцыяй. Такое сцвярджэнне ўтрымліваецца ў заяве старшыні Вярхоўнай рады Украіны Івана Плюшча.**

Як паведамляе агенцтва УНІАН, спікер зазначае: легітымна абраная ўлада тым і вызначаецца, што яе прызнаюць як тыя, хто выйграў, гэтак і тыя, хто прайграў. А для гэтага, лічыць Іван Плюшч, трэба заўсёды дакладна выконваць выбарчы закон.

Непрызнанне беларускай апазіцыяй вынікаў выбараў, на думку ўкраінскага спікера, азначае, што ў Беларусі, «на жаль, нічога не змянілася» і, значыць, «для перагляду стаўлення да гэтай краіны няма прычынаў». ■

УНІАН — БелаПАН

ФОТАФАКТ




Фота IREX/ProMedia

● 15 кастрычніка. Старшыню ўчастковай камісіі замяшчае лейтэнант міліцыі

# Кааліцыя патрабуе пераменаў

Вольга АНЦЫПОВІЧ

Пра стварэнне Кааліцыі маладзёжных арганізацыяў краіны заявілі на прэс-канферэнцыі для журналістаў прадстаўнікі сямі маладзёжных недзяржаўных структураў Беларусі («Маладая Грамада», «Маладзёжны хрысціянска-сацыяльны саюз», маладзёжная структура Аб'яднанай грамадзянскай партыі, «Асацыяцыя маладых прадпрымальнікаў», «Малады Фронт», «Задзіночанне беларускіх студэнтаў» і «Беларускае аб'яднанне маладых палітыкаў»).

Сваімі галоўнымі мэтамі Кааліцыя лічыць падрыхтоўку і правядзенне разнастайных супольных акцыяў, выпрацоўку сумеснага стаўлення да праблемаў беларускага грамадства, працу па падрыхтоўцы моладзі да рашучых дзеянняў увесну 2001 года, а таксама да прэзідэнцкіх выбараў, на якіх моладзь павінна будзе падтрымаць дэмакратычнага кандыдата.

12 лістапада Кааліцыя маладзёжных арганізацыяў мяркуе правесці масавую (некалькі дзесяткаў тысячаў, як мяркуюць арганізатары) маладзёжную вулічную акцыю пад агульным лозунгам «Пераменаў!» Па словах Паўла Севярынца, старшыні «Маладога Фронту», мерапрыемства павінна адбыцца ўвечары і абавязкова ў цэнтры горада. Па звычайным у апошні час маршруце апазіцыі – на плошчу Бангалор – новаўтвораная маладзёжная кааліцыя сваіх прыхільнікаў весці не збіраецца. І нават калі ўлады не дазволяць правядзенне акцыі у цэнтры горада, «яна ўсё роўна адбудзецца, але мы ні ў якім чыне не пойдзем на супрацьстаянне»,— заявіў спадар Севярынец. ■

# Да нас прыехалі рэвізоры з МАП

Юрась ХМЯЛЬНІЦКІ

**З 18 кастрычніка ў Мінску працуе прадстаўнічая арганізая Міжнароднай арганізацыі працы (МАП) на чале з выканаўчым дырэктарам Міжнароднага бюро працы МАП Кэры Тапіёла. Да 22 кастрычніка чарговая еўрапейская місія збіраецца дасканальна вывучыць сітуацыю з ціскам беларускіх уладаў на прафсаюзы.**

Гэты візіт меўся прайсці яшчэ напачатку верасня ў адказ на скаргу трох галіновых прафсаюзаў Федэрацыі прафсаюзаў на парушэнне прафсаюзных правоў, накіраваную яшчэ летам. Аднак па просьбе беларускага ўрада прыезд місіі МАП перанеслі на месяц пазней. З-за выбараў у палату прадстаўнікоў і з'езда ФПБ, які пераабраў старшыню Федэрацыі, улады не знайшлі б часу прыняць міжнародных гасцей, а калі дакладней, рэвізораў.

Выбары прайшлі, місія МАП у Мінску. За чатыры рабочыя дні эксперты МАП плануюць сустрэцца з прадстаўнікамі ўрада, з лідэрамі прафсаюзаў, якія скардзіліся ў МАП, — Аляксандрам Бухвоставым, Аляксандрам Ярашуком, Генадзем Фядынічам і старшынёй ФПБ Уладзімірам Ганчарыкам. Асобным планам значыцца ўдзел у трохбаковай сустрэчы наймальнікаў, прафсаюзаў ды прэзідэнцкай адміністрацыі.

Мяркуючы па ўсім, місія МАП можа прыйсці да высновы пра неабходнасць эканамічных санкцыяў да беларускіх уладаў, вядомых антыпрафсаюзнай палітыкай. ■

22 кастрычніка каля помніка Янкі Купалы адбудуцца традыцыйныя «**Літаратурныя спатканні**», якія ладзіць мінская гарадская арганізацыя Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны.
**Пачатак а 15-й гадзіне.**

# Пальто для диктатуры

**Александр ДУБРАВИН**

**Власть делает вид, что выборы состоялись. В ермошинском ведомстве пытаются свести концы с концами, и пишут отчеты, глядя в потолок. Чиновники важно надувают щеки, газеты трубят, телевидение и радио беснуются, Лукашенко вслух размышляет перед народом. Дескать, люди сделали свой выбор и не ошиблись.**

Между тем, списки новых назначенцев в палату №2 горько разочаровывают даже самых неисправимых романтиков из числа диванных мыслителей. Помнится, пару недель назад некоторые «аналитики» энергично утверждали, что новая палата будет кардинально отличаться от старой. Мол, она не станет такой же ручной и карманной, как прежняя. В нее придут совершенно новые люди. Депутаты нового органа возвысятся до понимания истинного парламентаризма и дадут бой авторитаризму. Ждите, намекали, сюрпризов. (Я, например, читал такие пассажи в «Белорусской Деловой Газете»). И что же? Смотрите, кто пришел! Ба! Все те же физиономии, с одного, так сказать, конвейера, одной кормушки и лечкомиссии.

Чудес не бывает. В заочном споре двух взглядов на нынешние выборы победила точка зрения тех, кто думает головой. Выборы не только превратились в фарс. Эти выборы уже стали похожи на особо опасное государственное преступление. Кажется, нет ни единого параграфа избирательного законодательства, который не был бы нынче нарушен. Никто уже не вспоминает о справедливости, честности, порядочности. Никто уже не ставит в вину власти хамство по отношению к независимым кандидатам и гражданам. Никто уже не вдается в юридические тонкости самого процесса. Одна просьба: соблюдали бы хоть бы свои, написанные для себя и под себя законы. Выполняли бы свои обещания, обильно даваемые международным посредникам.

Мы с вами присутствуем при тотальном, бессовестном, наглом разврате белорусских граждан властью. Можно подтасовать результаты, набросать в ящики бюллетеней, отсеять всех неугодных кандидатов, поменять местами цифры или вместо одних написать другие. Можно сделать вид, что при полном поражении одержал полную победу. Можно получить публичную поддержку у таких же, как и сам, диктаторских режимов. Нельзя сделать одного: заставить людей считать после этого существующую власть порядочной. А власть без авторитета – это просто временный перевес в силах, не более того. Собрал противник в ответ силу больше твоей — и все, суши сухари! Пойдя на подобную фальсификацию выборов, Лукашенко потерял несравненно больше, чем приобрел. Он потерял остатки уважения у той части населения, благодаря которой благополучно выплывал изо всех передряг, случавшихся за шесть лет его правления.

Вместе с тем, наличие в стране неустойчивой и катастрофически теряющей уважение граждан власти чревато опасными последствиями для всего общества. Эта ситуация приучает всех нас к игнорированию закона, к попыткам решать любые проблемы при помощи денег, силы, обмана. Суд становится декорацией. Закон – дышлом. Если на законы плюют те, кто их сочиняет, то рядовому гражданину и сам бог велел. Человек живет в аморальной атмосфере беззакония, безверия и цинизма, что самым негативным образом сказывается на всем обществе и приводит к непредсказуемым социальным последствиям. Эпидемия страшнейшего пьянства уже поразила нашу страну, за ней – очередь наркотиков, распада семей, физической и умственной деградации. Спустя десятилетия, а то и столетия белорусам будут аукаться несчастья, посеянные нездоровыми амбициями господина Лукашенко.

Но вернемся к выборам. Примерно за два года до них нынешнюю главу Центризбиркома (незаконно назначенную даже по лукашенковским законам) Лидию Ермошину стали возить по заграницам за счет объединенной Европы и водить под руки по избирательным участкам, как богатого еврея по Иерусалиму. Ей показывали, как проводят выборы порядочные люди. Наивные иностранцы полагали, что мы желаем проводить выборы честно, но не умеем. Поэтому они искренно делились опытом. А госпожа Ермошина, как рассказывают очевидцы, смотрела на пиршество истинной демократии осоловелыми глазами и вслух про себя отмечала: «Здесь можно сфальсифицировать. И здесь можно...». Это как в музее: один видит Данаю, а другой – голую бабу. Все зависит от воспитания и точки зрения. Воспитание г-жи Ермошиной и ее точка зрения на выборы нам известны со времен последнего референдума. Она, очевидно, считает, что массовые нарушения закона – в порядке вещей и продолжает старательно зарабатывать себе отрицательную карму. Но рядом, как опенки около трухлявого пня, уже появились десятки бессовестных председателей участковых избирательных комиссий, считающих возможным ПОДТАСОВЫВАТЬ результаты выборов. Странно, что они не боятся прочно связать свою дальнейшую судьбу с такой непостоянной вещью, как власть одного человека.

*Продолжение следует*

## НАРОДНАЕ МЕРКАВАННЕ

**1. Ці прымалі вы ўдзел у выбарах 15 кастрычніка?**

**2. Ці прымалі ўдзел у выбарах вашыя родныя і сябры?**



**Вольга, выкладчык у сярэдняй школе**

— Не, не хадзіла. Проста я не лічу, што з-за гэтага нешта змянілася б!

— Па большай частцы ніхто з маіх знаёмых не хадзіў.



**Міхаіл Ісакавіч, пенсіянер**

— Так, я хадзіў. У нас сямейная традыцыя такая яшчэ ад часоў бацькі майго грамадзянскі доўг свой выконваць. Трэба, значыць трэба!


— Родныя хадзілі, а вось за суседзяў не магу паручыцца.



**Наталля, студэнтка ВНУ**

— Не, я не хадзіла на выбары. Я ў прынцыпе палітыкай не вельмі цікаўлюся, ды і проста галасаваць не было за каго, каб як у Расіі былі партыйныя спісы, тады б можа быць.

— Ніхто не хадзіў з тых, каго я ведаю.



**Надзея, месца працы не назвала**

— Не хадзіла, бо не веру, што штосьці ў гэтай краіне можа змяніцца.

— Не хадзілі па той жа прычыне.



**Алег, часова беспрацоўны**

— Не, не хадзіў. Усе вынікі былі ўжо даўно вядомыя, чаго туды хадзіць, праўда?

— Усе, здаецца, хадзілі, бо так пажадалі.



**Аляксандр Уладзіміравіч, кіраўнік невялікага прадпрыемства**

— Пазіцыя ў мяне такая – галасаваць хадзіць няма чаго і няма за каго, і таму я праігнараваў гэтыя выбары.

— Не хадзіў ніхто з майго кола знаёмых.



**Леанід, рабочы**

— Не хадзіў канешне! Ведаеце, хлопцы, усе гэтыя выбары, шчыра кажучы, мне ўжо надакучылі. Я сам на «Гарызонце» працую, апошнія тры гады ніякіх зрухаў да лепшага – абсалютна. Тое, што пішуць, што ў нас там паляпшэнні нейкія – ерунда ўсё. І заробак вельмі маленькі.


— Не ведаю дакладна наконт усіх. Хто як.



**Таццяна, навучэнка**

— Не хадзіла, дзіця не было з кім пакінуць. А так не ведаю, мо і пайшла б.

— Хадзілі многія, хаця наконт многіх і не ведаю.



**Аляксей, студэнт**

— Так, хадзіў. Калі шчыра, то я пабаяўся, што ўсё роўна нехта мой бюлетэнь скарыстае. Але я ўсіх выкрасліў і з лёгкай душой дадому пайшоў.


— Не, не хадзілі, ім усё роўна.




**Максім ЗЯЦІКАЎ, працуе ў камерцыйнай фірме**

— Вы што, з глузду з'ехалі? Не, канешне, хто ж на такія выбары ходзіць?! Ды і нават калі б хацеў – не атрымалася б. Бо заняты надта быў.

— Не ведаю, чэснае слова! Не пытай ні ў кога.





**Апытвалі Аляксей ШЫДЛОЎСКІ і Уладзімір ШЛАПАК (фота)**

# Мне сверху видно все,

## или заметки высокопоставленного наблюдателя

**Валентина ТАРАН**

**Что делать, если в твою страну отказались приехать на парламентские выборы полноценные международные наблюдатели? Те полторы сотни вояжеров из близкого и не очень далёка, про которых нам все уши прожужжали по белорусскому радио и телевидению, доверие, увы, не внушали.**



Массовое гуляние на избирательном участке в день выборов

Фота REX/ProMedia

На самом деле — могут ли быть объективны коммерсанты и прочие деловые люди, имеющие личный интерес и откликнувшиеся на слезную просьбу белорусского посольства в соответствующей стране (о чем чистосердечно поведал накануне выборов симпатичный итальянец в телепередаче «Падзея»)? Полноценные наблюдатели — уважаемые, известные и независимые представители стран, направленные по решению парламентов и уполномоченных международных органов, были в явном меньшинстве. Разве что Россия да Украина прислали официальные группы...

Как быть? Ничего другого не оставалось, как назначить принципиального и неподкупного наблюдателя непосредственно от семьи. После недолгих препирательств единогласно сошлись на моей кандидатуре. Поручили наблюдение вести честно, открыто и гласно. Причем, решили, что я стану самым высокопоставленным наблюдателем на этих выборах, так как свое наблюдение буду производить с балкона 5-го этажа — самого высокого дома, расположенного неподалеку от участка №601 Тракторозаводского округа №110.

Спасибо за доверие. Прикинув, что, если на территории округа числится 63.161 избиратель, 5.077 из которых томились нетерпением сердца и проголосовали досрочно, а общее количество участков в округе — 38, то после несложных вычислений пришла к следующему выводу. При стопроцентной явке ежечасно в среднем в двери искомого объекта должно просачиваться 127 соискателей бюллетеней. Но так как сверхожиданий, связанных с повышенной активностью не было даже у самого оптимистичного человека в стране — А.Г.Лукашенко, то и я решила, что следует исходить из 50-процентной явки избирателей, т.е. в час ожидать не более 56 своих соседей по округу и участку.

Итак, 15 октября в день выборов я выходила на свой высокий пост трижды. В первый заход, в час пик с 11.45 до 12.45, я насчитала 86 человек, вошедших в гостеприимную дверь. Между прочим, о каждом избирателе могу рассказать массу подробностей: рост, цвет волос, возраст, наличие в руках клади, порода сопровождающих собак... Причем, учитывались все вошедшие, даже те, кто, возможно, пришел просто попить пиво. Удивительно, но почти не было семейных пар и тем более дружеских компаний. 17 человек прошествовали с палочками. Общая картина явки за наблюдаемый час вполне убедительная — более 67 процентов.

Второе наблюдение пришлось на время с 15.45 до 16.45. Приходится констатировать, что самые активные к этому времени уже выполнили свой долг перед родиной, и посему в заветную дверь участка № 601 заглянули всего 20 избирателей. Причем, четверых из них доставили на вполне приличных, по крайней мере, на поверхностный взгляд, иномарках. Скучновато, однако, наблюдать в «мертвый» час — всего-то 15,7 процента от ожидаемых среднестатистических соратников по участку прибыло. Так и президента можно подвести, уважаемые сограждане!

Третий выход на пост делаю в тревожное время с 18.35 до 19.35. Вечереет. На переулке Броневом чадят неяркие фонари. Памятуя, что на прошлом референдуме именно в последние часы набежала четверть голосующих, пристально всматриваюсь в одинокие силуэты, скользящие к дому с вожделенной урной. Таковых оказалось 33 человека. Чуть меньше 30 процентов от желаемых 127 избирателей.

Итак, суммирую свои наблюдения. За три часа под моим высокопоставленным постом прошло 139 избирателей. Можно сделать вывод, что в таком случае за 12 часов в среднем их прошло 556. Если на каждом участке данного округа, опять-таки в среднем, должно быть 1.662 избирателя, то половина избирателей на нашем участке составляет — 831. Почти 300 человек недобор! Кто виноват?

Тем не менее, по округу объявлен второй тур. Остается предположить, что соотечественники с других участков взяли на себя, а потом и выполнили повышенные обязательства, став живым укором мне и моим неактивным соседям. Но мы здесь ни причем. Депутат Красуцкий и кандидат в депутаты Дадалко — это не наш выбор. Что и требовалось доказать. ■

## ПОНЕДЕЛЬНИК • 23 ОКТЯБРЯ

16.00 Док. фильм «Люди с большой скалы».
16.25 Судьба человека.
17.00 Новости.
17.10 Столица.
17.40 Потребительская корзина.
18.00 **«ОСТРОВА НА ДАЛЕКИХ ОЗЕРАХ»**. Худ. фильм.
18.35 «Природа Беларуси - шаги к спасению». Док. фильм.
19.00 Новости.
19.15 Политические диалоги.
19.50 «Все мои дети». Сериал.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.35 Событие.
21.45 «Твой выбор». Теледебаты.
22.50 **«ТЕНИ ИСЧЕЗАЮТ В ПОЛДЕНЬ»**. Худ. фильм. 1-я серия.
00.10 Третий тайм.
00.40 Новости.
00.55 «СТВ-24 часа».

15.55 «Вавилонская башня». Сериал.
17.00 Новости.
17.25 Жди меня.
18.10 Погода.
18.15 Сериал «Ускоренная помощь-2».
18.50 Сериал «Черная комната».
19.50 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
21.00 Сериал «X-files».
22.40 Взгляд.
23.30 Новости.
23.45 Сериал «Человек ниоткуда».

16.00 Вести.
16.30 Мелодрама **«ПРИНЦЕССА ДЕЙЗИ»**. 1-я серия.
18.00 «История любви». Сериал.
19.00 Вести.
19.30 Подробности.
19.50 Мелодрама **«НА МУРОМСКОЙ ДОРОЖКЕ»**.
22.00 Вести.
22.30 После «Вестей».
22.40 Сериал «Профиль убийцы».
23.40 Дежурная часть.
23.50 Дневник «Кубка Кремля».

16.05 И.Дунаевский. Музыка кино.
16.30 «Фортуната и Хасинта». Сериал.
17.30 Новости культуры.
17.40 «Мир авиации».
18.00 «Из концертного зала».
18.35 «Кто там...».
19.00 Вечерняя сказка.
19.10 «Рекс». Мультсериал.
19.30 Новости культуры.
19.50 «Покрывало Пьеретты». Телеверсия спектакля.
20.40 После новостей...
21.00 **«ПЛЕМЯННИК РАМО»**. Худ. фильм.
22.15 Музыка во дворцах.
23.00 Новости культуры.

15.30 Сериал «Элен и ребята».
16.35 Впрок.
16.45 Футбольный клуб.
17.40 Криминал.
18.00 Сегодня.
18.30 Герой дня.
18.55 Сериал «Улицы разбитых фонарей-II».
20.05 «Криминальная Россия».
20.40 «Груз-2000».
21.00 Сегодня.
21.40 Сериал «Скорая помощь».
22.40 Тушите свет.
23.00 Сегодня в полночь.
23.30 «Футбольный клуб».

00.05 «Антропология».

TV6

05.00 День за днем.
05.45 Дорожный патруль.
06.00 День за днем.
08.00 Новости.
08.10 Боевик **«УНИВЕРСАЛЬНЫЙ СОЛДАТ. БРАТЬЯ ПО ОРУЖИЮ»**.
10.00 «Все в сад!».
10.30 «Про любовь».
11.05 Катастрофы недели.
12.00 День за днем.
13.30 «Своя игра».
14.00 Новости.
14.15 Телемагазин в Минске.
14.30 Сериал «Тропиканка».
15.30 «Отдохнем».
15.40 Телемагазин в Минске.
15.55 Телемагазин в Минске.
17.05 Сериал «Дежурная аптека III».
17.40 Дорожный патруль.
17.55 Театральный понедельник.
18.30 «Петерс поп-шоу».
19.00 Новости дня.
19.30 «Вы - очевидец».
20.25 Сериал «Западное крыло».
21.25 Дорожный патруль.
21.45 Новости.
22.05 Сериал «Алло, Алло!».
22.40 «Аллё, народ!».
23.00 ДИСК-канал.
23.30 Дорожный патруль.

8

17.30 «Мульт-планета».
17.50 «Телемагазин».
18.00 Программа Кеннета Коупленда.
18.30 Музыкально-развлекательная программа.
18.45 «К-видео Топ-8».
19.00 «Автопанорама».
19.10 «8 самых...».
19.20 «Виртуальный мир».
19.30 «СТВ - 24 часа».
19.45 Сериал «Экология человека». «Свет в душе».
20.20 Электрошоковое оружие! Защити себя!
20.25 «Вечарніца».
20.40 «Новости».
20.55 Историческая драма **«ЕРМАК»**. 1-я серия. «Рождение атамана».
21.45 «SOL - Minsk» представляет...
21.50 Рэйчел Гриффитс в худ. фильме **«Я, ОПЯТЬ Я, И СНОВА Я»**.

НОЧНОЙ КАНАЛ
23.50 Новости.
00.00 «Ночь с Ларисой Грибалевой».
01.00 Мистический триллер Джорджа Ромеро **«ДЕНЬ МЕРТВЫХ»**.
02.45 «СТВ - 24 часа».

Для абонентов СП «Космос ТВ» передачи транслируются на русском языке.
09.30 Автогонки класса гранд-туризм.
11.30 Велоспорт.
12.30 Теннис. АТП. Тулуза.
14.30 Теннис. ВТА. Линц.
15.30 Ролики.
16.30 Суперкросс.
17.30 Автогонки класса гранд-туризм.
18.30 Сумо.
19.30 Евроголы. Футбольный журнал.
21.00 Триал на грузовиках.
21.30 Триал на грузовиках.
22.30 Ралли. Сан-Ремо.
23.30 Футбольный журнал о сборной Франции.
00.00 Евроголы.
01.30 Формула.



## ВТОРНИК • 24 ОКТЯБРЯ

08.00 Новости.
08.10 Политические диалоги.
08.40 Потребительская корзина.
09.00 Новости.
09.10 Детский экран. Мультфильм.
09.25 Ток-шоу «Это - XXI».
10.10 «Все мои дети». Сериал.
11.00 Новости.
11.15 «Все мои дети». Сериал.
12.00 На соискание Госпремии РБ. Цикл «Древо жизни».
12.25 Третий тайм.
13.00 Новости.
13.10 Детектив **«СМЕРТЬ ПОД ПАРУСОМ»**. 1-я серия.
14.15 Турсбъектив.
14.35 Теленавигатор.
15.00 Новости.
15.10 **«БЕЛЫЙ СЛОН»**. Худ. фильм.
16.25 «5х5».
17.00 Новости.
17.15 «Мир вертлявой камышевки». Видеофильм.
17.55 «Я возвращаю Ваш портрет». Музыкальный фильм.
19.00 Новости.
19.20 «Москва - Минск».
19.40 Фильмы братьев Люмьер.
19.50 «Все мои дети». Сериал.
20.45 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.35 Событие.
21.50 **«ТЕНИ ИСЧЕЗАЮТ В ПОЛДЕНЬ»**. Худ. фильм. 2-я серия.
23.05 Музыка без границ.
23.35 Новости.
23.50 «СТВ-24 часа».

08.00 Новости.
08.20 «Вавилонская башня». Сериал.
09.25 Сериал «Ускоренная помощь-2».
10.00 Сериал «Черная комната».
11.00 Новости.
13.30 Программа «Вместе».
14.00 Новости.
14.20 Мультсериал «Охотники за привидениями».
14.45 Царь горы.
15.15 ...До шестнадцати и старше.
15.55 «Вавилонская башня». Сериал.
17.00 Новости.
17.25 Сериал «Дикие звезды Голливуда».
18.00 Как это было. «Страсти по Андрею». 1965 год.
18.40 «Убойная сила»: «След глухаря».
19.50 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
21.00 Фильм **«ДАВАЙ ПОЖЕНИМСЯ»**.
22.35 «Цивилизация».
23.10 Новости.
23.25 Сериал «Майк Хаммер».

08.00 Вести.
08.15 Черным по белому.
08.20 Дежурная часть.
08.35 «Пес Динки». Мультсериал.
09.00 «Мануэла». Сериал.
10.00 Вести.
10.30 «Санта-Барбара». Сериал.
16.00 Вести.
16.30 Мелодрама **«ПРИНЦЕССА ДЕЙЗИ»**. 2-я серия.
18.00 «История любви». Сериал.
19.00 Вести.
19.30 Подробности.
19.50 Комедия **«МЕНЯЛЫ»**.
22.00 Вести.
22.30 После «Вестей».
22.40 Сериал «Профиль убийцы».
23.40 Дежурная часть.
23.50 Дневник «Кубка Кремля».
00.20 Док. фильм «Галя».
01.00 Формула скорости.

07.05 Новости культуры.
07.20 После новостей...
07.40 **«ХАРАКТЕР»**. Худ. фильм.
09.40 Русь-деревня.
10.30 «Фортуната и Хасинта». Сериал.
11.30 Новости культуры.
11.40 **«ИСПОЛНЕНИЕ ЖЕЛАНИЙ»**. Худ. фильм.
13.15 Сюита из музыки балета «Любовью за любовь».
13.30 Новости культуры.
13.45 Кубок Кремля по теннису.
15.00 Новости.
15.10 «Маленький бродяга». Сериал.
15.35 Берега Набокова. «Узоры Каиссы».
16.05 В.Моцарт. Симфония №40.
16.30 «Фортуната и Хасинта». Сериал.
17.30 Новости культуры.
17.40 «Ноу-хау».
17.55 «Дама с собачкой».
18.40 «Цитаты из жизни».
19.20 Вечерняя сказка.
19.30 Новости культуры.
19.50 Русь-деревня.
20.40 После новостей...
21.00 **«ХАРАКТЕР»**. Худ. фильм.
23.00 Новости культуры.

05.00, 05.30, 05.45, 06.00, 06.30, 06.45, 07.00, 07.30 Сегодня утром.
06.20, 07.45 Карданный вал.
06.35 Мультфильм.
07.55 Сериал «Улицы разбитых фонарей-II».
09.00 Сегодня.
09.20 Сериал «Скорая помощь».
10.10 Сериал «Любовь и тайны Сансет Бич».
11.00 Сегодня.
11.25 Фильм **«АКВАНАВТЫ»**.
13.00 Сегодня.
13.30 Криминал.
14.00 Старый телевизор.
15.00 Сегодня.
15.30 Сериал «Элен и ребята».
16.35 Впрок.
16.45 Сериал «Страсти».
17.40 Криминал.
18.00 Сегодня.
18.30 Герой дня.
18.55 Сериал «Улицы разбитых фонарей-II».
20.05 Суд идет.
21.00 Сегодня.
21.35 Футбол. Лига чемпионов. «Динамо» (Киев) - ПСВ.
23.50 Сегодня в полночь.
00.20 «Антропология».

TV6

05.00 День за днем.
05.45 Дорожный патруль.
06.00 День за днем.
08.00 Новости.
08.10 Боевик **«ПРАВОСУДИЕ»**.
10.10 Сериал «Западное крыло».
11.05 Скандалы недели.
12.00 День за днем.
13.30 «Петерс поп-шоу».
14.00 Новости.
14.15 Телемагазин в Минске.
14.30 Сериал «Тропиканка».
15.30 «Отдохнем».
15.40 Телемагазин в Минске.
17.05 Сериал «Дежурная аптека III».
17.40 Дорожный патруль.
17.55 «БИС».
18.30 «Петерс поп-шоу».
19.00 Новости дня.
19.30 «Академия собственных Ашибок».
20.25 Сериал «Западное крыло».
21.25 Дорожный патруль.
21.45 Новости.
22.05 Сериал «Алло, Алло!».
22.40 «Аллё, народ!».
23.00 ДИСК-канал.
23.35 Триллер **«УВИДЕТЬ И УБИТЬ»**.
01.15 Дорожный патруль.

8

17.30 «Мульт-планета».
17.50 «Телемагазин».
18.00 Программа К.Коупленда.
18.30 Музыкально-развлекательная программа.
18.45 «К-видео Топ-8».
19.00 «Автопанорама».
19.10 «8 самых...».
19.20 «Виртуальный мир».
19.30 «СТВ - 24 часа».
19.45 Док.сериал «Последний миф».
20.25 «Вечарніца».
20.40 «Новости».
20.55 Драма **«ЕРМАК»**. 2-я серия. «Царские ослушники».
21.45 Телемагазин.
21.50 Николай Караченцев в худ. фильме **«КРИМИНАЛЬНЫЙ КВАРТЕТ»**.

НОЧНОЙ КАНАЛ
23.50 Новости.
00.00 В баре «У Олега».
00.45 Бильярдный клуб.
01.05 Звезды в ночи.
01.50 «СТВ-24 часа».

09.30 Формула.
10.30 Триал на грузовиках. Обзор сезона.
11.30 Ралли. Сан-Ремо.
12.30 Евроголы.
14.00, 21.00 Теннис. ВТА. Москва.
17.00 Теннис. АТП. Базель.
22.00 Бокс.

## СРЕДА • 25 ОКТЯБРЯ

08.00 Новости.
08.15 «Сегодня с вами...».
08.40 Потребительская корзина.
09.00 Новости.
09.15 Здоровье.
09.40 Мультфильм.
10.15 Столичный хит.
11.00 Новости.
11.15 «Все мои дети». Сериал.
12.00 Око. О рекламе и не только...
12.20 Компьютерный полигон.
12.40 Мультсериал «Телетун».
13.00 Новости.
13.10 Док.экран «Кого любишь - выбирай».
13.20 **«СМЕРТЬ ПОД ПАРУСОМ»**. Худ. фильм. 2-я серия.
14.25 Ток-шоу «Карамболь».
15.00 Новости.
15.15 Мультфильм.
15.45 Видимо-невидимо.
17.00 Новости.
17.10 «Макаенка,9».
17.40 **«Я ШАГАЮ ПО МОСКВЕ»**. Худ. фильм.
19.00 Новости.
19.15 «Телевизионный Дом кино».
19.45 Лотерея «Толока».
19.55 «Все мои дети». Сериал.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.35 Событие.
21.50 **«ТЕНИ ИСЧЕЗАЮТ В ПОЛДЕНЬ»**. Худ. фильм. 3-я серия.
23.00 Королевская охота.
23.30 Новости.
23.45 «СТВ-24 часа».
00.00 Баскетбол. Кубок Корача. «Гродно-93»(Беларусь) - «Шахтер» (Россия).

08.00 Новости.
08.20 «Вавилонская башня». Сериал.
09.25 «Убойная сила»: «След глухаря».
10.30 Сериал «Дикие звезды Голливуда».
11.00 Новости.
13.30 Программа «Вместе».
14.00 Новости.
14.20 Мультсериал «Охотники за привидениями».
14.45 Зов джунглей.
15.15 ...До шестнадцати и старше.
15.55 «Вавилонская башня». Сериал.
17.00 Новости.
17.25 Сериал «Дикие звезды Голливуда».
18.00 Человек и закон.
18.40 «Остановка по требованию»: «Пассажиры с детьми».
19.50 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
21.00 Боевик **«ПОБЕГ ИЗ НЬЮ-ЙОРКА»**.
22.50 Шахматные короли: М.Ботвинник и В.Смыслов.
23.25 Новости.
23.40 Сериал «Майк Хаммер».

08.00, 10.00, 16.00 Вести.
08.15 Черным по белому.
08.20 Дежурная часть.
08.35 «Пес Денки». Мультсериал.
09.00 «Мануэла». Сериал.
10.30 «Санта-Барбара». Сериал.
16.30 Мелодрама **«ДВОЙНОЙ ОБМАН»**. 1-я серия.
18.00 «История любви». Сериал.
19.00 Вести.
19.30 Подробности.
19.50 Фильм **«КАДРИЛЬ»**.
22.00 Вести.
22.30 После «Вестей».
22.40 Премьера программы «1000 и одна жизнь».
23.20 Дежурная часть.
23.30 Дневник «Кубка Кремля».
00.00 «Кинескоп». Фильм «In vino veritas».
00.55 Прогноз погоды.

07.05 Новости культуры.
07.20 После новостей...
07.40 **«УСКОЛЬЗАЮЩАЯ КРАСОТА»**. Худ. фильм.
09.35 «Нацизм. Предупреждение истории». Док. сериал.
10.30 «Фортуната и Хасинта». Сериал.
11.30 Новости культуры.
11.40 **«РАССКАЗ НЕИЗВЕСТНОГО ЧЕЛОВЕКА»**. Худ. фильм.
13.30 Новости культуры.
13.45 Кубок Кремля по теннису.
15.00 Новости.
15.10 «Маленький бродяга». Сериал.
15.35 «Чао, мое сокровище». Док. фильм.
16.30 «Фортуната и Хасинта». Сериал.
17.30, 19.30 Новости культуры.
17.40 Штрихи к портрету художника.
18.05 Кто мы? «Россия на Кавказе».
18.30 «О времени и о себе».
19.10 Вечерняя сказка.
19.20 «Рекс». Мультсериал.
19.50 «Нацизм. Предупреждение истории». Док.сериал.
20.45 После новостей...
21.05 **«УСКОЛЬЗАЮЩАЯ КРАСОТА»**. Худ. фильм.
23.00 Новости культуры.

05.00, 05.30, 05.45, 06.00, 06.30, 06.45, 07.00, 07.30 Сегодня утром.
06.35 Мультфильм.
07.55 Сериал «Улицы разбитых фонарей-II».
09.00 Сегодня.
09.25 Дневник Лиги чемпионов по футболу.
10.10 Сериал «Любовь и тайны Сансет Бич».
11.00 Сегодня.
11.30 Приключенческий фильм **«БЕЛОЕ ПРОКЛЯТЬЕ»**.
13.00 Сегодня.
13.35 «Среда».
14.00 Старый телевизор.
15.00 Сегодня.
15.30 Сериал «Элен и ребята».
16.35 Впрок.
16.45 Сериал «Страсти».
17.40 Криминал.
18.00 Сегодня.
18.30 Герой дня.
18.55 Сериал «Улицы разбитых фонарей-II».
20.05 Совершенно секретно.
21.00 Сегодня.
21.35 Футбол. Лига чемпионов. «Байер» (Леверкузен) - «Спартак» (Москва).
23.50 Сегодня в полночь.
00.20 «Антропология».

TV6

05.00 День за днем.
05.45 Дорожный патруль.
06.00 День за днем.
08.00 Новости.
08.10 Худ. фильм **«ЛАВИНА»**.
10.10 Сериал «Западное крыло».
11.00 «Пальчики оближешь».
11.30 «Х-фактор».
12.00 День за днем.
13.30 «Петерс поп-шоу».
14.00 Новости.
14.15 Телемагазин в Минске.
14.30 Сериал «Тропиканка».
15.30 «Отдохнем».
15.50 Телемагазин в Минске.
17.05 Сериал «Дежурная аптека III».
17.40 Дорожный патруль.
17.55 «Наши любимые животные».
18.30 «Петерс поп-шоу».
19.00 Новости дня.
19.30 Ток-шоу «Я сама».
20.25 Сериал «Западное крыло».
21.25 Дорожный патруль.
21.45 Новости.
22.05 Сериал «Алло, Алло!».
22.45 «Аллё, народ!».
23.05 ДИСК-канал.
23.40 Комедия **«ПРАЗДНЫЕ ЛЮДИ»**.
01.15 Дорожный патруль.

8

17.30 «Мульт-планета».
17.50 «Телемагазин».
18.00 Программа К.Коупленда.
18.30 Музыкально-развлекательная программа.
18.45 «К-видео Топ-8».
19.00 «Автопанорама».
19.10 «8 самых...».
19.20 «Виртуальный мир».
19.30 «Гурман-клуб».
19.50 Док.сериал «Последний миф».
20.25 «Вечарніца».
20.40 «Новости».
20.55 Историческая драма **«ЕРМАК»**. 3-я серия. «Неизведанная Сибирь».
21.45 Электрошоковое оружие! Защити себя!
21.50 Эрик Робертс, Дин Кэйн в боевике **«БЕЗ АЛИБИ»**.

НОЧНОЙ КАНАЛ
23.50 Новости.
00.00 Ночь с Л.Грибалевой.
01.00 « К-видео» для взрослых.
01.20 Звезды в ночи.

09.30 Евроголы.
11.00, 12.00, 21.00 Велоспорт. Чемпионат мира по треку.
14.00, 00.30 Теннис. ВТА. Москва.
17.00 Теннис. АТП. Базель.

## ЧЕТВЕРГ

08.00 Новости.
08.15 Сельчане.
08.40 Потребительская корзина.
09.00 Новости.
09.10 Королевская охота.
09.40 Мультфильм.
10.00 «Все мы родом из детства».
11.00 Новости.
11.10 «Все мои дети». Сериал.
11.55 На соискание Госпремии РБ. Цикл «Древо жизни».
12.20 «Неистовая Айседора». Музыкальный фильм.
13.00 Новости.
13.10 «Поминальная молитва». Спектакль. Действие 1-е.
14.40 «Зубр». Телефильм.
15.00 Новости.
15.15 Док. фильм «Встреча в Мельбурне».
17.00 Новости.
17.10 Арсенал.
17.35 Усадьба.
18.00 «Поэт Андрей Миронов». Киноконцерт.
19.00 Новости.
19.15 «Строки из биографии».
19.35 Телебарометр.
19.55 «Все мои дети». Сериал.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.35 Событие.
21.50 **«ТЕНИ ИСЧЕЗАЮТ В ПОЛДЕНЬ»**. Худ. фильм. 4-я серия.
23.05 Новости.
23.20 «СТВ-24 часа».

08.00 Новости.
08.20 «Вавилонская башня». Сериал.
09.25 «Остановка по требованию»: «Пассажиры с детьми».
10.30 Сериал «Дикие звезды Голливуда».
11.00 Новости.
13.30 Программа «Вместе».
14.00 Новости.
14.20 Мультсериал «Охотники за привидениями».
14.45 Программа «100%».
15.15 ...До шестнадцати и старше.
15.55 «Вавилонская башня». Сериал.
17.00 Новости.
17.25 Сериал «Дикие звезды Голливуда».
18.00 «Процесс».
18.40 «Империя под ударом»: «Авель и Каин».
19.50 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
21.00 Футбол. Кубок УЕФА. «Локомотив» (Москва) - «Интер» (Братислава).
22.55 «Тихий дом».
23.30 Новости.
23.45 Сериал «Майк Хаммер».

08.00 Вести.
08.15 Черным по белому.
08.20 Дежурная часть.
08.35 «Пес Динки». Мультсериал.
09.00 «Мануэла». Сериал.
10.00 Вести.
10.30 «Санта-Барбара». Сериал.
16.00 Вести.
16.30 Мелодрама **«ДВОЙНОЙ ОБМАН»**. 2-я серия.
18.00 «История любви». Сериал.
19.00 Вести.
19.30 Подробности.
19.50 Боевик **«ЛИКВИДАТОР»**.
22.00 Вести.
22.30 После «Вестей».
22.40 Сериал «Профиль убийцы».
23.40 Дежурная часть.
23.50 Дневник «Кубка Кремля».
00.20 Горячая десятка.

07.05 Новости культуры.
07.20 После новостей...
07.40 **«ДОН ХУАН»**. Худ. фильм. 1-я серия.
09.10 «Мои дела - цветущие поляны».
09.35 «Нацизм. Предупреждение истории». Док.сериал.
10.25 «Фортуната и Хасинта». Сериал.
11.30 Новости культуры.
11.40 **«НЕОТПРАВЛЕННОЕ ПИСЬМО»**. Худ. фильм.
13.15 М.Брух.
13.30 Новости культуры.
13.45 Кубок Кремля по теннису.
15.00 Новости.
15.10 «Маленький бродяга». Сериал.
15.35 Док. фильмы.
16.25 «Фортуната и Хасинта». Се-

## 26 ОКТЯБРЯ


риал.
17.30, 19.30 Новости культуры.
17.40 Век московского эстампа.
18.05 «Время музыки».
18.30 Шекспир. XX век.
19.10 Вечерняя сказка.
19.20 «Рекс». Мультсериал.
19.50 «Нацизм. Предупреждение истории». Док.сериал.
20.40 После новостей...
21.00 **«ДОН ХУАН»**. Худ. фильм. 1-я серия.
22.20 Джазофрения.
23.00 Новости культуры.



05.00, 05.30, 05.45, 06.00, 06.30, 06.45, 07.00, 07.30 Сегодня утром.
05.15, 07.15 Спорт, погода.
05.20, 06.15 Криминал.
05.35, 06.50 Большие деньги.
05.50, 07.20 Впрок.
06.20, 07.45 Карданный вал.
06.35 Мультфильм.
07.55 Сериал «Улицы разбитых фонарей-II».
09.00 Сегодня.
09.25 Дневник Лиги чемпионов по футболу.
10.10 Сериал «Любовь и тайны Сансет Бич».
11.00 Сегодня.
11.25 Фильм **«ЗАВТРА БЫЛА ВОЙНА»**.
13.00 Сегодня.
13.30 Служба спасения.
14.00 Старый телевизор.
15.00 Сегодня.
15.30 Сериал «Элен и ребята».
16.35 Впрок.
16.45 Сериал «Страсти».
17.40 Криминал.
18.00 Сегодня.
18.30 Герой дня.
18.55 «Гибель линкора». Фильм из цикла «Новейшая история».
19.55 Независимое расследование.
21.00 Сегодня.
21.40 Сериал «Скорая помощь».
22.40 Тушите свет.
23.00 Сегодня в полночь.
23.30 «Антропология».



14.00 Новости.
14.15 Телемагазин в Минске.
14.30 Сериал «Тропиканка».
15.30 «Отдохнем».
15.40 Телемагазин в Минске.
15.55 Телемагазин в Минске.
17.05 Сериал «Дежурная аптека III».
17.40 Дорожный патруль.
17.55 «Фасон».
18.30 «Петерс поп-шоу».
19.00 Новости дня.
9.30 Сериал «И снова 33 квадратных метра».
20.35 Сериал «Западное крыло».
21.40 Дорожный патруль.
21.55 Новости.
22.15 Сериал «Алло, Алло!».
22.55 «Аллё, народ!».
23.15 ДИСК-канал.
23.50 Триллер **«ИЗНУРЕННАЯ»**.
01.25 Дорожный патруль.



17.30 «Мульт-планета».
17.50 «Телемагазин».
18.00 Программа К.Коупленда.
18.30 Музыкально-развлекательная программа.
18.45 «К-видео Топ-8».
19.00 «Автопанорама».
19.10 «8 самых...».
19.20 «Виртуальный мир».
19.30 «СТВ - 24 часа».
19.45 Док.сериал «Последний миф».
20.20 «SOL - Minsk» представляет...
20.25 «Вечарніца».
20.40 «Новости».
20.55 Драма **«ЕРМАК»**. 4-я серия. «От плахи к почестям».
21.45 Новости «К-видео».
22.05 Комедия **«ФОКУС-ПОКУС»**.
НОЧНОЙ КАНАЛ
23.50 Новости.
00.00 «Foxy-music» с Т.Лисицкой.
01.00 Гурман-клуб.
01.20 Звезды в ночи.
02.20 СТВ-24 часа.



11.00, 12.00, 21.00 Велоспорт. Чемпионат мира по треку.
14.00, 01.30 Теннис. ВТА. Москва.
17.00 Теннис. АТП. Базель.
23.30 Футбол. Один мир, один Кубок. Журнал.
00.30 Гоночная линия. Автоспортивный журнал.

## ПЯТНИЦА • 27 ОКТЯБРЯ

[БТ]

08.00 Новости.
08.10 Столица.
08.40 Потребительская корзина.
09.00 Новости.
09.15 Мультиклуб.
09.45 **«ОГНЕВУШКА-ПОСКАКУШКА»**. Худ. фильм.
10.15 Усадьба.
10.40 Телебарометр.
11.00 Новости.
11.15 «Все мои дети». Сериал.
12.00 Сделано в Беларуси.
12.15 Бон тон.
12.45 Мультфильм.
13.00 Новости.
13.15 «Поминальная молитва». Спектакль. Действие 2-е.
14.25 «Телевизионный Дом кино».
15.00 Новости.
15.10 **«АССОЛЬ»**. Худ. фильм.
16.15 Регион.
16.40 Телебарометр.
17.00 Новости.
17.10 **«ОСЕННИЕ ЯБЛОКИ»**. Худ. фильм.
17.55 Док. фильм «Дикие ясли».
19.00 Новости.
19.20 «Магия вечности». Телеочерк.
19.50 «Все мои дети». Сериал.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.35 Событие.
21.50 **«ТЕНИ ИСЧЕЗАЮТ В ПОЛДЕНЬ»**. Худ. фильм. 5-я серия.
23.05 Новости.
23.20 «СТВ - 24 часа».

[1]

08.00 Новости.
08.20 «Вавилонская башня». Сериал.
09.25 «Империя под ударом»: «Авель и Каин».
10.30 Сериал «Дикие звезды Голливуда».
11.00 Новости.
13.30 Программа «Вместе».
14.00 Новости.
14.20 Приключенческий фильм **«КОРОЛЬ ДИКОГО ЗАПАДА»**.
15.55 «Вавилонская башня». Сериал.
17.00 Новости.
17.25 «С легким паром!».
18.05 Спасатели. Экстренный вызов.
18.40 Поле чудес.
19.50 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.45 Кремль-9. Заговор против Хрущева.
21.30 Сериал «Черная комната».
22.25 Триллер **«МЕРТВ ПО ПРИБЫТИИ»**.
00.20 Новости.

[РТР]

08.00 Вести.
08.15 Черным по белому.
08.20 Дежурная часть.
08.35 «Пес Динки». Мультсериал.
09.00 «Мануэла». Сериал.
10.00 Вести.
10.30 «Санта-Барбара». Сериал.
16.00 Вести.
16.30 Мелодрама **«БОЛЬШЕЙ ЛЮБВИ НЕ БЫВАЕТ»**.
18.00 «История любви». Сериал.
19.00 Вести.
19.30 Подробности.
19.50, 22.40 «Кто же этот Петросян?».
22.00 Вести.
22.30 После «Вестей».
23.40 В пятницу вечером.
00.40 Дневник «Кубка Кремля».
01.10 Дежурная часть.

[К]

07.05 Новости культуры.
07.20 После новостей...
07.40 **«ДОН ХУАН»**. Худ. фильм. 2-я серия.
09.05 Музыка барокко в Патриарших палатах Московского Кремля.
09.30 «Нацизм. Предупреждение истории». Док.сериал.
10.20 «Фортуната и Хасинта». Сериал.
11.30 Новости культуры.
11.40 **«ЛОСЕНОК»**. Худ. фильм.
13.15 Э.Вилла Лобас. «Шоро».
13.30 Новости культуры.
13.45 Кубок Кремля по теннису.
15.00 Новости.
15.10 «Маленький бродяга». Сериал.
15.35 Док. фильмы.
16.20 «Фортуната и Хасинта». Сериал.
17.30 Новости культуры.
17.40 Московский эстамп.
18.05 «Выбранные места из...».
18.20 В вашем доме.
19.00 Вечерняя сказка.
19.10 «Рекс». Мультсериал.
19.30 Новости культуры.
19.50 «Нацизм. Предупреждение истории». Док.сериал.
20.40 После новостей.
21.00 **«ДОН ХУАН»**. Худ. фильм. 2-я серия.
22.25 Вечера с Юлием Кимом.
23.00 Новости культуры.

[НТВ]

05.00, 05.30, 05.45, 06.00, 06.30, 06.45, 07.00, 07.30 Сегодня утром.
06.20, 07.45 Карданный вал.
06.35 Мультфильм.
07.55 «Гибель линкора». Фильм цикла «Новейшая история».
09.00 Сегодня.
09.20 Сериал «Скорая помощь».
10.10 Сериал «Любовь и тайны Сансет Бич».
11.00 Сегодня.
11.25 Фильм **«НОВЕНЬКАЯ»**.
13.00 Сегодня.
13.30 Герой дня без галстука.
14.00 Старый телевизор.
15.00 Сегодня.
15.30 «Улица Сезам».
15.55 Сериал «Элен и ребята».
16.35 Впрок.
16.45 Сериал «Страсти».
17.40 Криминал.
18.00 Сегодня.
18.45 «Глас народа».
20.05 «О, счастливчик!».
21.00 Сегодня.
21.45 «Женский взгляд».
22.20 Тушите свет.
22.35 Боевик **«ЧАСТНЫЙ ДЕТЕКТИВ»**.

[TV6]

05.00 День за днем.
05.45 Дорожный патруль.
06.00 День за днем.
08.00 Новости.
08.10 Комедия **«ПРАЗДНЫЕ ЛЮДИ»**.
10.00 Сериал «Западное крыло».
11.00 «Мое кино».
11.30 Без вопросов. Жасмин.
12.00 День за днем.
13.30 «Петерс поп-шоу».
14.00 Новости.
14.15 Телемагазин в Минске.
14.30 Сериал «Тропиканка».
15.30 «Отдохнем».
15.40 Телемагазин в Минске.
15.55 Телемагазин в Минске.
17.05 «Амба-ТВ».
17.35 Дорожный патруль.
17.50 Сериал «Самые громкие преступления XX века».
19.00 Новости дня.
19.30 Боевик **«УНИВЕРСАЛЬНЫЙ СОЛДАТ. НЕЗАКОНЧЕННОЕ ДЕЛО»**.
21.25 Новости.
21.45 Дорожный патруль.
21.55 Триллер **«ОХОТА ЗА НАСЛЕДСТВОМ»**.
23.40 ДИСК-канал.
00.45 Дорожный патруль.

[8 канал]

17.30 «К-видео» для детей.
17.50 «Телемагазин».
18.00 Программа Кеннета Коупленда.
18.30 Музыкально-развлекательная программа.
18.45 «К-видео Топ-8».
19.00 «Автопанорама».
19.10 «8 самых...».
19.20 «Виртуальный мир».
19.30 «СТВ - 24 часа».
19.45 Док. сериал «Последний миф».
20.25 «Вечарніца».
20.40 «Новости».
20.55 Драма **«ЕРМАК»**. 5-я серия. «Бессмертие».
21.45 Электрошоковое оружие! Защити себя!
21.50 Худ. фильм **«КРОВЬ НА ЕЕ РУКАХ»**.
НОЧНОЙ КАНАЛ
23.50 Новости.
00.00 Ночь с Ларисой Грибалевой.
01.00 Hi End.
02.00 СТВ-24 часа.

[Спорт]

08.00, 13.00, 00.15 Мотоспорт. Чемпионат мира по кольцевым мотогонкам. Австралия.
11.00, 12.00, 21.00 Велоспорт. Чемпионат мира по треку.
14.00 Теннис. ВТА. Москва.
17.00 Теннис. АТП. Базель.

## СУББОТА • 28 ОКТЯБРЯ

[БТ]

07.00 **«ЭТОТ НЕГОДЯЙ СИДОРОВ»**. Худ. фильм.
08.05 Сущность.
08.30 Усадьба.
09.00 Новости.
09.10 Потребительская корзина.
09.25 «Сегодня с вами...».
09.50 «Ящик для детей будущего». Сериал.
10.20 Мультфильм.
10.40 «Все нормально, мама!» Развлекательная программа.
11.10 Компьютерный полигон.
11.30 Вершина мира.
11.55 Книгосбор.
12.25 Родовод.
13.00 Сериал «На гребне волны».
13.45 Сделано в Беларуси.
14.00 Олимп.
14.30 Познай себя.
14.55 Фильмы братьев Люмьер.
15.00 Новости.
15.15 «Рыжий клоун».
15.35 «Все мы родом из детства».
16.30 Худ. фильм **«ЧУЧЕЛО»**.
18.35 Авторская программа Юрия Азаренка «Тайные пружины политики».
19.00 Новости.
19.15 Из достоверных источников.
19.35 КВН.
21.00 Панорама.
21.50 **«ТЕНИ ИСЧЕЗАЮТ В ПОЛДЕНЬ»**. Худ. фильм. 6-я и 7-я серии.
00.05 Видимо-невидимо.

[1]

07.00 Новости.
07.10 Слово пастыря.
07.25 Что да как.
07.45 Комедия «Альф».
08.15 Клуб путешественников.
09.00 Новости.
09.10 Смак.
09.30 Смехопанорама.
10.10 Детектив **«ДОПИНГ ДЛЯ АНГЕЛОВ»**.
11.55 Играй, гармонь любимая!
12.25 Сериал «Сверхъестественное: невиданные силы животных».
13.05 Здоровье.
13.45 История одного шедевра.
14.00 Новости.
14.10 Комедия «Баффи».
15.10 КОАПП.
15.35 «101 далматинец».
16.05 «Ералаш».
16.15 В поисках утраченного. Василий Меркурьев.
17.00 Новости.
17.10 «Мы чье, дурачье?». Вечер Михаила Задорнова.
18.10 Детектив **«УМЕРЕТЬ НЕКОГДА»**.
20.00 Время.
20.40 Остросюжетный фильм **«ЧЕРНЫЙ ДОЖДЬ»**.
23.00 Фильм **«НА ИГЛЕ»**.

[РТР]

06.30 Диалоги о рыбалке.
07.00 **«ГОРБУН ИЗ НОТР-ДАМА»**. Худ. фильм.
08.30 «Пес Динки». Мультсериал.
08.50 Прогноз погоды.
09.00 Доброе утро, страна.
09.45 «Сто к одному».
10.35 Сам себе режиссер.
11.05 «Друзья-II». Сериал.
11.35 Золотой ключ.
11.55 «Комиссар Рекс». Сериал.
13.00 Вести.
13.20 Фильм **«ЧЕЛОВЕК, КОТОРОГО Я ЛЮБЛЮ»**.
15.00 «Международная панорама».
16.00 «Пресс-клуб».
17.00 Моя семья.
18.00 «ТВ Бинго шоу».
19.00 Вести.
19.30 Сам себе режиссер.
20.00 «Городок».
20.40 Криминальная драма **«ДУРАКИ УМИРАЮТ ПО ПЯТНИЦАМ»**.
22.40 Остросюжетный фильм **«ХЭЛЛОУИН: 20 ЛЕТ СПУСТЯ»**.
00.20 Дневник «Кубка Кремля».
00.50 Формула скорости.
01.15 Прогноз погоды.

[К]

09.05 «Аистенок».
09.30 «Российский курьер».
10.10 **«МНОГО ШУМА ИЗ НИЧЕГО»**. Худ. фильм.
11.25 «Дюймовочка». Мультфильм.
11.55 Бабушкины рецепты.
12.10 Мой цирк.
12.35 «Щелкунчик».
13.00 Дворцовые тайны.
13.30 Новости культуры.
13.45 «Про Петрушку». Мультфильм.
14.00 Кубок Кремля по теннису.
16.00 Pro memoria.
16.15 Сенсация. Сенсация? Сенсация...
16.40 «День рождения Паганэля».
17.30 Сферы.
18.10 «Царская ложа».
18.50 Вечерняя сказка.
19.00 «Рекс». Мультсериал.
19.10 Острова.
20.05 Джаз мемориз.
20.30 Парижский журнал.
21.00 Новости культуры.
21.20 Блеф-клуб.
22.00 **«СОЛЯРИС»**. Худ. фильм. Часть 1-я.

[НТВ]

07.00 Сегодня.
07.15 Сериал «Девушки из Лидо».
08.15 «О, счастливчик!».
09.00 Сегодня.
09.15 Криминал.
09.45 Фильм **«ДОРОГА»**.
10.25 «Растительная жизнь».
11.00 Сегодня.
11.25 Большие деньги.
11.55 Исторический фильм **«ЯРОСЛАВНА, КОРОЛЕВА ФРАНЦИИ»**.
13.40 «В нашу гавань заходили корабли».
14.40 «Свидетель века».
15.00 Сегодня.
15.30 Профессия - репортер.
15.50 Интересное кино.
16.20 Дог-шоу «Я и моя собака».
16.50 Сериал «Она написала убийство».
18.00 Сегодня.
18.35 «Один день».
19.00 «О, счастливчик!».
19.50 Сериал «Агент национальной безопасности».
21.00 Сегодня.
21.45 Боевик **«РОККИ-III»**.
23.35 Детектив **«КОНЕЦ НАСИЛИЯ»**.

[TV6]

05.50 Худ. фильм **«ИСТОРИЯ СОБАКИ-ПРИЗРАКА»**.
07.25 Дорожный патруль.
07.35 Ваша музыка. Анастасия.
09.05 Программа «БИС».
09.35 «Про любовь».
10.10 Театральный понедельник.
10.40 Телемагазин в Минске.
10.50 «Пальчики оближешь».
11.25 Без вопросов. Группа «Иванушки Инт.».
12.00 Новости.
12.15 «Наши любимые животные».
12.55 «Своя игра».
13.25 «Академия собственных Ашибок».
14.25 Ток-шоу «Я сама».
15.25 «Х-фактор».
16.00 «Мое кино».
17.45 Дорожный патруль.
18.00 Скандалы недели.
19.00 Новости дня.
19.15 Боевик **«ИГРА С ОГНЕМ»**.
21.05 Фильм **«МИЛОСЕРДИЕ»**.
23.20 «Лихорадка субботним вечером».
23.55 Дорожный патруль.
00.10 Фильм **«ЛЕТНЯЯ ГОРЯЧКА»**.

[8 канал]

12.45 «Телемагазин».
13.00 «Европа сегодня».
13.30 КВН «Чтобы поняли».
15.00 Джойс Майер. «Жизнь в слове».
15.30 «Братья Гримм» (программа по письмам телезрителей).
16.30 Худ. фильм **«БЕГЛЕЦ-2»**.
18.30 Мульт-планета.
19.15 Худ. фильм **«ЗЕМЛЯ САННИКОВА»**.
20.45 «Вечарніца».
21.00 «Сокровища».
21.20 Дензел Вашингтон в худ. фильме **«УРАГАН»**.
23.30 «К-видео» для взрослых.
НОЧНОЙ КАНАЛ
23.50 Шоу продолжается...
01.20 Худ. фильм **«СИЯНИЕ»**.

[Спорт]

08.00, 14.00, 01.15 Мотоспорт. Чемпионат мира по кольцевым мотогонкам. Австралия.
11.00, 15.30, 21.30 Велоспорт. Чемпионат мира по треку.
12.30 Теннис. ВТА. Москва.
18.00 Теннис. АТП. Базель.
00.15 Горные лыжи. Женщины, гигантский слалом.

## ВОСКРЕСЕНЬЕ • 29 ОКТЯБРЯ

[БТ]

07.00 **«В СТАРЫХ РИТМАХ»**. Худ. фильм.
08.30 Здоровье.
09.00 Новости.
09.15 Потребительская корзина.
09.30 «Сегодня с вами...».
10.00 Мультиклуб.
10.30 «Вас вызывает Спортландия».
11.20 Туробъектив.
11.40 «Все нормально, мама!».
12.10 Арсенал.
12.35 Зорная ростань.
13.05 «На волне взаимопонимания».
13.50 Сериал «На гребне волны».
14.35 Сельчане.
15.00 Новости.
15.20 Комедия **«ЛЮБИМАЯ ЖЕНЩИНА МЕХАНИКА ГАВРИЛОВА»**.
16.35 Теленавигатор.
16.55 «Дожинки». Гала-концерт с участием мастеров искусств Беларуси.
19.05 «Судьба человека».
19.35 Стадион.
20.00 Резонанс.
20.55 Ток-шоу «Карамболь».
21.30 Худ. фильм **«СЛОВА И МУЗЫКА»**.
23.15 Столичный хит.
23.55 Новости.
00.15 Хоккей. Чемпионат Беларуси. ХК «Минск» - «Полимир» (Новополоцк).

[1]

07.00 Новости.
07.10 Армейский магазин.
07.40 «101 далматинец».
08.05 Утренняя звезда.
09.00 Новости.
09.10 «Непутевые заметки».
09.30 Пока все дома.
10.10 Приключенческий фильм **«КОНТРАБАНДА»**.
11.50 Утренняя почта.
12.20 В мире животных.
13.05 «Эх, Семеновна!».
13.45 История одного шедевра.
14.00 Новости.
14.10 Комедия «Баффи».
15.00 Умницы и умники.
15.35 «Все о Микки Маусе».
16.00 Песня года.
16.25 «Женские истории».
17.00 Новости.
17.15 «Ералаш».
17.25 КВН-2000.
19.30 Погода.
19.35 Боевик **«ТРУДНАЯ МИШЕНЬ»**.
21.30 «Времена». Программа Владимира Познера.
22.25 «На футболе» с В.Гусевым.
23.10 Фильм **«АМЕРИКАНЦЫ»**.

[РТР]

06.30 Премьера док.фильма «Пролог Великой Отечественной войны. Мифы и факты». Часть 3-я.
07.10 Мультфильмы.
07.30 Папа, мама, я - спортивная семья.
08.15 Почта РТР.
08.45 Доброе утро, страна.
09.15 «Аншлаг» и К°.
10.15 «Городок».
10.45 Русское лото.
11.25 Федерация.
12.05 Парламентский час.
13.00 Вести.
13.20 Диалоги о животных.
14.00 Планета Земля.
15.00 Футбол. Чемпионат России-2000. «Зенит» (Санкт-Петербург) - «Спартак» (Москва).
17.00 «Зеркало».
18.20 Сериал «Марш Турецкого».
20.10 «Аншлаг» и К°.
21.15 Бенефис Ирины Аллегровой.
00.10 Дневник «Кубка Кремля».
00.40 «Футбол + ТВ».
01.25 Прогноз погоды.

[К]

09.05 «ДТА».
09.30 **«ОТРОКИ ВО ВСЕЛЕННОЙ»**. Худ. фильм.
11.00 Экспедиция «Чиж».
11.30 «Консилиум».
11.55 Архитектурная галерея.
12.10 Графоман.
12.35 «Щелкунчик».
13.00 «Портрет города на фоне города».
13.30 Новости культуры.
13.45 «В гостях у гномов». Мультфильм.
14.00 Кубок Кремля по теннису.
16.00 Власть факта.
16.15 Зарубежное документальное кино.
17.05 Смехоностальгия.
17.30 **«ПОГРАНИЧНЫЙ ГОРИЗОНТ»**. Худ. фильм.
18.25 Опера «Каменный гость».
19.55 Вечерняя сказка.
20.05 XX век. Избранное.
21.00 Новости культуры.
21.20 «Вокзал мечты».
21.45 **«СОЛЯРИС»**. Худ. фильм. Часть 2-я.

[НТВ]

07.00 Сегодня.
07.15 Сериал «Агент национальной безопасности».
08.15 «О, счастливчик!».
09.00 Сегодня.
09.20 «Женский взгляд».
09.50 Без рецепта.
10.20 «Полундра».
11.00 Сегодня.
11.30 Служба спасения.
12.00 Сериал «Неприкасаемые».
12.55 «Криминальная Россия».
13.30 «Третий тайм».
14.30 «Рублевая зона».
15.00 Сегодня.
15.30 Большие родители.
16.00 Путешествия натуралиста.
16.30 Профессия - репортер.
16.55 Сериал «Она написала убийство».
18.00 Итоги.
19.35 Куклы.
19.50 Сериал «Агент национальной безопасности».
21.00 «Итого».
21.25 Комедия **«ШИРЛИ-МЫРЛИ»**.
00.00 Сериал «Падшие ангелы».

[TV6]

05.50 Боевик **«ИГРА С ОГНЕМ»**.
07.20 Дорожный патруль.
07.35 «Star Старт».
08.05 «Фасон».
08.40 «Шоу Бенни Хилла».
09.15 «Сеть».
09.50 Телемагазин «Спасибо за покупку!».
10.00 «Все в сад!».
10.25 «Я знаю все».
11.25 Канон.
11.55 Дорожный патруль.
12.15 Сериал «Самые громкие преступления XX века».
13.15 «Амба-ТВ».
13.45 Телемагазин «Спасибо за покупку!».
13.55 «Вы - очевидец».
14.55 Сериал «И снова 33 квадратных метра».
16.10 Катастрофы недели.
17.05 Ваша музыка. Мила Романиди.
17.55 Дорожный патруль.
18.15 Триллер **«ПОДНЕВОЛЬНЫЕ ЖЕРТВЫ»**.
20.00 Фантастический фильм **«НОЧНЫЕ ГОСТИ»**.
21.50 Остросюжетный фильм **«ИНОСТРАННЫЙ ТОВАР»**.
23.25 «С Днем рождения, «ДИСК-канал».

[8 канал]

12.45 «Телемагазин».
13.00 « Как жизнь?».
13.20 Фильм-сказка **«АЛЕНЬКИЙ ЦВЕТОЧЕК»**.
14.30 «Гурман-клуб».
14.50 «Телемагазин».
15.00 Программа Рика Реннера.
15.30 «Доктор Икс».
16.30 Олег Табаков в худ.фильме **«НЕСКОЛЬКО ДНЕЙ ИЗ ЖИЗНИ ОБЛОМОВА»**.
18.45 Новости «К-видео».
19.15 Сериал «Агата Кристи. Зеркальное убийство».
20.45 Вечарніца.
21.00 В баре «У Олега».
21.45 Триллер **«ИНСТИНКТ»**.
НОЧНОЙ КАНАЛ
23.50 Шоу продолжается...
00.45 Триллер **«ЗА ГРАНЬЮ РЕАЛЬНОГО»**.

[Спорт]

03.00, 08.00, 14.00, 21.30 Мотоспорт. Чемпионат мира по кольцевым мотогонкам.
07.00 Горные лыжи.
11.00 Велоспорт. Чемпионат мира по треку.
12.30 Теннис. ВТА. Москва.
16.30 Велоспорт. Чемпионат мира по треку.
19.30 Теннис. АТП. Базель.
23.00 Теннис. ВТА. Москва.
00.15 Горные лыжи. Мужчины, гигантский слалом.
01.15 Велоспорт. Чемпионат мира по треку.

# Беларускае багацце: цуд

Міхал ЗАЛЕСКІ

**Там, дзе канчаецца зямля нашых крэўных, у бяздоннай Расіі ці сытай Еўропе нашага жыцця не разумеюць. Бо ў іх даўно няма чарадзеяў. Ім жыць нецікава. Прысмактаўся Захад да сібірскай сыравіны — і ўсе дзівосы. Разлічвай сабекошт энерганосьбітаў ды прагназуй будучыню з дакладнасцю да хвіліны. Не тое Беларусь. Наш край і сёння як зачараваны кубак: не ўхапіць чужынцу – пральецца, а не праліе, дык атруціцца. Заходнім мудрацам, чым выбарамі тутка займацца, было б лепей спытацца ў тутэйшых: як гэна ў нас летам адбылося.**

Вось на малюнку, як гара расце, паказана, які калі плён быў. Добра відаць, ды і кожнаму зразумела, што не ўсякі год зародзіць. Рысачкамі пададзеная тая ж самая інфармацыя, толькі паказчыкі штораз браліся сярэднія за пяць апошніх гадоў. У такі спосаб найпрасцей разгледзець сапраўдную тэндэнцыю, адхіліўшы ўплыў надвор'я ды іншых выпадковых фактараў.

Ідэйна-палітычныя адрозненні развітога сацыялізму ад рынкавага ў нашу справу ўблытваць не станем. Але як зайшло аб сацыялізме, то прыгадаем словы Сталіна пра кадры, узброеныя тэхнікай, каторыя вырашаюць усё. Каб пацвердзіць гэтую тэзу, пабудуем маленькую таблічку.




| | 1982 | 1984 | 2000 |
|---|---|---|---|
| Працаздольныя вяскоўцы, тыс.чал. | 2200 | 2100 | 1300 |
| Засеяна, тыс.га | 2923 | 2832 | 2450 |
| Трактары, тыс | 122 | 129 | 86 |
| Камбайны, тыс | 30 | 33 | 18 |
| Грузавікі, тыс | 77 | 85 | 50 |
| Намалацілі, тыс.т | 5104 | 5043 | 5100 |

Паколькі традыцыя пагалоўнага ўдзелу ў бітве за ўраджай не адмененая, то мы бярэм не колькасць калгаснікаў, а ўсіх вяскоўцаў ад 16 гадоў да 60 мужчынаў і да 55 жанчынаў. Яна відавочна скарацілася амаль на 40%.

З розных прычынаў засеялі збажыной на 12% меней зямлі. Мо засеялі і тое самае, але ж памятаеце, як памарозіла вясной ды на пачатку лета.

Людзей паменела, а бач: і сеялі, і перасявалі ўсё бясплатна, бо не было яшчэ Лукашэнкавага загаду, каб за работу ды грошы плаціць.


Сеялі тое ў крыху іншую зямлю, чым за савецкім часам. Бо, прыкладам, мінеральных угнаенняў прыпадала ў 1980-1984 гады на тыя зерневыя і зернебабовыя пад 220 кг дзейснага рэчыва на 1 га, а ў 1995 укінулі толькі 109 кг, у 1996 – 136 кг, 1998 – 195 кг. Пра гэтак званую «арганіку», то бок гной, і пісаць не будзем, бо кароваў стала меней і кормяць іх горай і саляркі не стае, каб вывозіць, і г.д. Цёмная, карацей, справа, а зямля, пэўна, бяднейшая, чым была.

Каб надта паменела трактараў, дык не скажаш, усяго на траціну. Трэба толькі ўлічваць, што стала з імі яшчэ «дэвальвацыя». Бо з наяўных трактараў працаваць магло на 1 ліпеня 2000 года толькі 80%. Амаль тое было і з грузавікамі, жывых налічылі на тую ж дату 71%. А камбайны, дык наогул, напалову колькасці былі нерухомыя.

І вось сабралася палавіна ад былых калгаснікаў ды на палове ад той тэхнікі, што некалі была, правяла найвыдатнейшую бітву за ўраджай і на меншай плошчы чым, у 80-я гады, намалаціла болей, чым за СССРам.

Дык ці то СССРаўскія калгаснікі мелі сухія рукі, ці то зараз, пры калгасным капіталізме яны працуюць, як шасцірукі індыйскі бог, не разбяруцца нашыя суседзі ніколі.

Вам, панове чытачы, сакрэт таго адкрыю. Мы ж на бацькаўшчыне Усяслава Чарадзея жывем, а Сталін наўмысна хлусіў вялікаму савецкаму народу. Цуд усё вырашае. Вось. ■



Рэдакцыя прапаноўвае сваім падпісчыкам аформіць падпіску праз аддзяленні «Беларусбанка».

Для афармлення падпіскі адпаведную квітанцыю (гл. ніжэй) трэба выразаць нажніцамі. Адзначце ў квітанцыі тэрмін, на які афармляеце падпіску, прозвішча падпісчыка і паштовы адрас, на які дастаўляць газету.

**Кошт падпіскі на адзін месяц 675 руб. Калі вы жадаеце падпісацца на больш тэрмін, то павялічце суму ў адпаведную колькасць разоў.**

## КВІТАНЦЫЯ ДЛЯ «БЕЛАРУСБАНКА»

**Форма № ПД-5**

**ИЗВЕЩЕНИЕ**

УНН 101562750 **Редакция газеты «Наша СВАБОДА»**
получатель платежа
Отделение «Центральное» ОАО «Белбизнесбанк»
г.Минск, код 493; Минск, пл.Свободы, 17
наименование банка

Счет получателя 3012205160015 Лицевой счет

(фамилия,имя,отчество)

(индекс) (адрес)

На 2000 год по месяцам:

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|

**За подписку на газету «Наша СВАБОДА»** Сумма

Пеня
Плательщик Всего

Кассир

УНН 101562750 **Редакция газеты «Наша СВАБОДА»**
получатель платежа
Отделение «Центральное» ОАО «Белбизнесбанк»
г.Минск, код 493; Минск, пл.Свободы, 17
наименование банка

Счет получателя 3012205160015 Лицевой счет

(фамилия,имя,отчество, адрес)

На 2000 год по месяцам:

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|

**КВИТАНЦИЯ**

**За подписку на газету «Наша СВАБОДА»** Сумма

Кассир

Пеня
Плательщик Всего

# Дэмакратыя немагчымая без жанчын

Таццяна АНТОНАВА-МЕЛЬЯНОВІЧ

**Мінулым тыднем у Мінску прайшла Міжнародная канферэнцыя «Еўропа-XXI стагоддзе. Жанчыны і палітыка». Яна была наладжаная грамадскім аб'яднаннем «Жаночы незалежны дэмакратычны рух» і Міжнародным адукацыйным цэнтрам у Дортмундзе. На ёй прысутнічалі прадстаўнікі Парламенцкай Асамблеі Савета Еўропы, Першы сакратар пасольства ЗША ў Беларусі Майкл Райнерт, Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Турэцкай Рэспублікі ў Беларусі Шуле Сойсал, прадстаўнікі палітычных партыяў, арганізацыяў, жаночых саюзаў і асацыяцыяў Беларусі і замежных краінаў.**

Феміністкі рух на Захадзе ў 60-х гадах забяспечыў прарыў жанчын у палітыку. У паўночных краінах Еўропы жанчыны складаюць амаль 40% у парламентах, займаюць вялікую колькасць ключавых пастоў. У Фінляндыі ў дзяржаўных установах для жанчын устаноўленая квота — 40/60. Нават у Гане прынятае рашэнне аб прадастаўленні жанчынам 40% пасадаў, звязаных з прыняццем рашэнняў.

А вось у палатах беларускага парламента жанчын можна пералічыць па пальцах. Гэта значыць, што яны фактычна не ўдзельнічаюць у прыняцці важных рашэнняў. Многія жанчыны не ўсведамляюць, што іх жыццё звязанае з палітыкай і што менавіта яны найбольш пакутуюць ад няправільнага палітычнага курсу.

Беларускія мужчыны ў адносінах да «жаночага пытання» цвёрдыя традыцыяналісты. Яны скептычна ставяцца да жанчын, схільных да грамадскай і тым больш да палітычнай дзейнасці, не ўхваляюць імкненне жанчын да эканамічнай незалежнасці, іх жаданне на роўных удзельнічаць у прыняцці рашэнняў.

Выкладчыца жаночага недзяржаўнага інстытута «Энвіла» Ірына Чыкалава выступіла на канферэнцыі з тэмай « Феміністкая рэвізія палітыкі». Асноўныя яе пастулаты: «Фемінізм гаворыць, што любы чалавек па сваёй сутнасці — палітык», «Любая акцыя, якая ўспрымаецца як пратэст супраць традыцыйнага,— палітычная», «Усё персанальнае з'яўляецца палітычным», «Фемінізм як палітыка і як ідэалогія змыкаецца з усімі палітычнымі рухамі ў справе пабудовы адкрытага дэмакратычнага грамадства».

Аб тым, што жанчыны Беларусі прачынаюцца ад летаргічнага сну, пачалі ўсведамляць сваю адказнасць за будучыню, сведчыць ужо колькасць жаночых грамадскіх арганізацыяў, створаных у Беларусі за апошняе дзесяцігоддзе. Гэта «Саюз жанчын», «Беларуская арганізацыя працоўных жанчын», «Усебеларуская жаночая ліга», «Адраджэнне Айчыны», Жаночая ліберальная асацыяцыя, «Асацыяцыя маладых хрысціянскіх жанчын», «Жаночы адказ», шэраг праваабарончых арганізацыяў.

Парламентарый з Латвіі Інесса Бізніеце, якая значную частку жыцця пражыла ў Амерыцы, у сваёй прамове адзначыла:

— Я ганаруся, што ў XXI стагоддзе Латвія ўваходзіць з жанчынай-прэзідэнтам. Дзве з шасці партыяў узначальваюць жанчыны, 24% жанчын — прадпрымальнікі. Гэта сведчыць пра арганізаванасць нашых жанчын.

Арганізаваныя жанчыны — сапраўды сіла. Сфармуецца яна і ў нашай рэспубліцы, і з ёй давядзецца лічыцца і ўладам. ■



# Мастацтва патрабуе ахвяраў

## Мара пра родны кут нараджаецца ў студэнцкім інтэрнаце, і не ўсім суджана ўвасобіць яе ў жыцьцё

Таццяна АНТОНАВА-МЕЛЬЯНОВІЧ

**У інтэрнат Беларускай акадэміі мастацтваў я трапіла выпадкова. Мае правінцыйныя сябры папрасілі зайсці і адведаць іх дачку. Інтэрнат доўга шукаць не трэба – гэта за два крокі ад праспекта Скарыны.**


Фота Ул. ШЛАПАКА

Першы паверх быў увесь без святла, шкло ў вокнах перапэцканае фарбай. Мабыць, рамонт, вырашыла я. І радасная ад таго, што пра маладых людзей у нашай краіне гэтак дбае дзяржава, увайшла ў будынак.

...Галіна, так завуць дачку маіх знаёмых, не разгубілася, апусціла кіпяцільнік у шкляную банку і запрасіла да стала. Я прысела ля маленькага століка і агледзелася. Тры ложкі, адна шафа для адзення, заваленая зверху кніжкамі, палічка з посудам, прыкрытая занавескай, пісьмовы стол з дарэвалюцыйнай лямпай і такі самы стул.

Бытавыя ўмовы ў гэтым інтэрнаце даволі суровыя. На 50-60 чалавек, што пражываюць на адным паверсе, – адзін туалет і кухня з разбітымі і вечна бруднымі ад калектыўнай эксплуатацыі плітамі. А душавы пакой дык увогуле адзін на ўвесь інтэрнат. Сваё адзенне жыхары інтэрната мыюць і сушаць у пакоі. У рэальнасці без чаргі нікуды не трапіш. Слабыя тут проста не выжываюць. Дзеці заможных бацькоў перасяляюцца на прыватныя кватэры, а бедныя, як і сто гадоў таму, павінны быць моцнымі.

Да жыцця ў інтэрнаце студэнты-першакурснікі, якія вучацца тут на мастакоў, скульптараў, дызайнераў, акцёраў і рэжысёраў, прывыкаюць не адразу. У першыя месяцы калектывісцкага жыцця ў многіх здараюцца нервовыя зрывы. Немагчымасць пабыць аднаму, расслабіцца, адпачыць, кепска адбіваецца на псіхіцы.

У такіх зняважлівых для чалавечай годнасці ўмовах жывуць і сталеюць будучыя творцы, якія мараць выхоўваць у людзях імкненне да прыгажосці, дасканаласці і гармоніі. Дысананс паміж тым, чаму вучацца, і як тут жывуць, – ашаламляльны.

Галіна ў гэтым інтэрнаце на Сурганава, 14 жыве ўжо пяты год.

— Прывыкла, — кажа яна, — месца тут зручнае, цэнтр. Плата за пражыванне сімвалічная – 500 рублёў, якраз па маіх даходах. А яшчэ я падрабляю на палову стаўкі, за верасень атрымала 9 тысяч рублёў. Невялікі, але дадатак да маёй стыпендыі.

Пасля заканчэння акадэміі дзяўчына мяркуе застацца ў Мінску. Тут яна можа рэалізаваць свае здольнасці. А са сваёй часовай прапіскай яна можа жыць толькі ў інтэрнаце. Ды цяперашні дах існуе, пакуль яна вучыцца. Аднак з ім давядзецца хутка развітацца, а трапіць у інтэрнат для творчых работнікаў, які мае сталічная філармонія, не прасцей, чым на Месяц.

— Умовы жыцця там троху лепшыя, чым у нас,— кажа Галіна. – Я там бывала ў сваіх сяброў-артыстаў. Нядаўна хадзіла на пахаванне аднаго з «вечных» жыхароў, які пражыў не адзін дзесятак гадоў у інтэрнацкім пакоі. Таленавіты і вясёлы чалавек – музыкант прафесійнага калектыву, а пражыў без уласнага кута. Уяўляеце, з якім пачуццём праважалі мы яго ў апошні шлях. Многія разумеюць, што ў такім самым становішчы могуць аказацца самі.

Кіраўніцтва Беларускай акадэміі мастацтваў рознымі шляхамі спрабуе палепшыць умовы жыцця ў інтэрнаце. Года паўтара назад здалі ў арэнду бізнесоўцу некалькі пакояў на першым паверсе пад аптэку. Аптэка на гэткім людным месцы – справа патрэбная для народа і прыбытковая для яе гаспадара. Цяпер бізнесоўцу быццам бы аддадзены ў арэнду ўвесь першы паверх інтэрната (ён яго рамантуе – а я па наіўнасці думала: наша дзяржава). У знак удзячнасці бізнесмен абяцаў адрамантаваць інтэрнацкую душавую. І выканаў абяцанне. Пафарбаваў там столь і сцены, паставіў дубовыя дзверы. Але ад пары дзверы ўжо дэфармаваліся, а сцены і столь аблупіліся. У выніку ўсёй гэтай аперацыі жыхары інтэрната пазбавіліся пакоя, абсталяванага пральнымі машынамі. І цяпер мусяць праць у бадзейках. Пазбавілася інтэрнацкае жыхарства і ранейшага прыстойнага фае. Ды і што ім у прыстойным фае рабіць? ■

# Дармавіна, альбо Як беларусы «кінулі» Colgate

Кірыла ПАЗЬНЯК

**Паводле дадзеных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, ужо ў сямігадовым узросце 90% беларусаў пачынаюць пакутваць на стаматалагічныя захворванні. Разам з генетычнай спадчынай і дрэннай экалагічнай сітуацыяй адной з прычынаў называецца элементарная непісьменнасць у наглядзе за ротам. Спецыялісты даводзяць, што толькі два з дзесяці беларусаў умеюць правільна чысціць зубы.**


Дзеля «лікбезу» у гэтай інтымнай гігіенічнай справе фірма *Colgate* разам з міністэрствам аховы здароўя і Беларускім грамадскім аб'яднаннем стаматолагаў з 9 кастрычніка наладзілі акцыю «Месяц здаровай усмешкі». Яна прадугледжвала паслугі бясплатнага медычнага агляду ў платных стаматалагічных клініках. У акцыі занята 130 стаматолагаў у Мінску, абласных цэнтрах краіны, а таксама ў Маладзечне, Слуцку, Навагрудку, Талачыне, Іўі. Дантысты павінны былі не толькі агледзіць раты беларусаў на карыес, даць адмысловыя кансультацыі, але і распавесці, як і чым (да ўсяго кожнаму наведвальніку абяцаўся цюбік калгейтаўскай пасты) трэба прыбірацца ў роце.

Аднак *Colgate* не зусім, відаць, улічыла тутэйшую ментальнасць, і ў выніку беларусы проста «завалілі» эксперымент па адыходзе беларускай стаматалогіі ад прынцыпаў вырашэння зубной праблемы не выключна лячэннем, а не разам з прафілактычнымі праграмамі.

На пытанне, як праходзіць акцыя, дырэктар беларускага прадстаўніцтва *Colgate* Сяргей Буры адказаў, што «народ ідзе як хворы». У тым сэнсе, што за першы ж тыдзень яе правядзення была разабраная ўся зубная паста – ажно 12 тысячаў цюбікаў. Яно не дзіўна – усё ж дармавая, хай сабе нават не ў стандартнай, а ва ўзорнай тары на нейкія там 20 грамаў. Сяргей Буры абурана і разгублена кажа, што на дармавіну абрынуліся «бамжы, алкаголікі і пенсіянеры», а зусім не «мэтавая аўдыторыя». Карацей, звярталіся тыя, каму і прафілактыка, у прынцыпе, даўно не патрэбная (позна піць «Баржомі», калі ныркі адваліліся). Многія не збіраліся нават сядаць у крэсла для агляду шчарбатых ратоў – забіралі пасту і сыходзілі.

Зразумець незадаволенасць ініцыятараў акцыі можна: далёка не заможныя халяўшчыкі наўрад ці стануць купляць надалей дарагую ў параўнанні з беларускай пасту *Colgate*.

У выніку арганізатары нават прыбралі з БТ ролік, дзе рэкламаваўся гэты стаматалагічны месячнік. А што яны думалі – тут і мільёна штук зубной пасты не хапіла б! ■



# Адным лыкам шытыя

## «Беларуская энцыклапедыя», падобна ўладам, паважае «Апетыт» і не любіць «Голад»

Генадзь ЛАГУНОВІЧ

**У маёй калекцыі захоўваюцца савецкія газеты, якія выходзілі падчас галадамораў. Загалоўкі ў перыёдыцы, датаванай 1921–1922 гадамі, стракацяць словамі «голод» і «голодающие» Насельнікі краіны, якой правілі бальшавікі, грызлі мёрзлую зямлю, трацілі розум, выміралі сем'ямі і вёскамі.**

І ў далейшым гэтая трагедыя, хоць і глуха, але згадвалася ў гістарычнай і даведачнай літаратуры. А вось пра галодны мор 1932–1933 гадоў, ад якога толькі на Украіне загінула да 7 мільёнаў чалавек, у тагачасных газетах, у тым ліку ўкраінскіх, не знайсці і намёку: выконваўся загад Сталіна – трымаць у таямніцы. Затое ўсе цэнтральныя і мясцовыя выданні надрукавалі яго прамову на з'ездзе калгаснікаў-ударнікаў у лютым 1933 года, дзе прагучала такая хлусліва-цынічная фраза: «Мы добились того, что миллионные массы бедняков, жившие раньше впроголодь, стали теперь... людьми обеспеченными». Па іроніі лёсу менавіта ў тыя дні гэпэўшнікі ў глыбокай тайне вялі ўлік жудасных выпадкаў людаедства на Украіне, якіх за чатыры з паловай месяцы – з 1 снежня 1932 года да 15 красавіка 1933-га – зафіксавана 2.500.

Гэты голад не абышоў паўднёвыя і цэнтральныя раёны Беларусі, дзе было шмат смяротных сыходаў. Ізноў з'явіліся жабракі, якія заходзілі і ў хату на ўскраіне Оршы, дзе жыла, таксама галаднавата, наша сям'я. Мне, у той час школьніку, асабліва запомніліся бледныя твары і кашчавыя рукі тых, хто здолеў дабрацца да нас з далёкіх мясцінаў Беларусі і Украіны.

Толькі падчас «гарбачоўскай галоснасці» ў друку пачалі з'яўляцца публікацыі на гэтую тэму. І не дзіўна: галадамор 1932–1933 гадоў у значнай ступені быў справакаваны масавымі рэквізіцыямі і рэпрэсіямі, чым займалася, зразумела, сама «рабоча-сялянская ўлада».

Думалася, Беларуская энцыклапедыя (БелЭн), што зараз выдаецца, будзе актыўна запаўняць «белыя плямы» ў нашай гісторыі. Але стваральнікі галоўнага даведніка і сёння замоўчваюць гэтую трагічную падзею, дзеля чаго пайшлі на ашуканства чытача. Справа ў тым, што ў энцыклапедыях прынятая сістэма спасылак, якая аблягчае знаходжанне неабходных звестак. Калі слова ў тэксце выдзелена курсівам, дык на старонках выдання абавязкова змяшчаецца публікацыя пад такім назовам. Насуперак гэтаму правілу, 5-ты том БелЭн выйшаў без артыкула «Голад», хоць у 1-ым томе (артыкул «Апетыт») ёсць спасылка на гэтае паняцце. Не спраўдзіліся, такім чынам, спадзяванні даведацца, колькі людзей скасіў голад на



пачатку 30-х гадоў у Беларусі.

Рэч, пэўна, не толькі ў тым, што нашы энцыклапедысты мусяць прытрымлівацца камуністычных догмаў і міфаў, нярэдка пазбягаючы нават нязначнай крытыкі савецкага таталітарнага рэжыму, роднаснага цяперашняй тутэйшай уладзе. Яшчэ ў большай ступені ідэалагічныя «табу» тычацца сённяшняга дня. Ён, маўляў, павінен адлюстроўвацца належным чынам, бо па змесце БелЭн праз гады будуць меркаваць аб перыядзе дзейнасці «першага прэзідэнта рэспублікі». Публікацыя ж пра голад нават без згадвання сучаснай Беларусі магла б стаць ускосным папрокам правіцелю. Тлумачэнне тут простае: у ёй прайшлося б давесці, што гэтая сацыяльная з'ява праяўляецца не толькі ў яўнай форме, але і ў скрытай (калі людзі недаядаюць, у рацыёне іх харчавання адсутнічаюць жыццёва важныя кампаненты). А ў нас жа больш паловы жыхароў пакутуюць ад недаядання, ад скрытага голаду.

Сталін толькі аднойчы наведаў сельскія раёны, але на вышэйпамянёным з'ездзе калгаснікаў атрымаў тытул – «передовой колхозник». Нашы цяперашнія «передовые колхозники» часта наведваліся ў калгасы, але якая з гэтага карысць? Што тычыцца праўды, дык сённяшнія «передовики»-ўладары баяцца яе не менш, чым ранейшыя. Таму і хаваюцца злачынствы камуністычнага рэжыму і антынародная сутнасць лукашэнкаўскай палітыкі. Таму аказаўся перакрэсленым і актуальны артыкул «Голад», што папоўніла спіс шматлікіх замоўчванняў, скажэнняў і фальсіфікацыяў на старонках Беларускай энцыклапедыі. ■

# Жывёльны свет чарнобыльскай зоны

Мікалай ГРАЧУХА

Палескі радыеэкалагічны запаведнік, створаны ў 30-кіламетровай зоне Чарнобыльскай катастрофы, можа быць скарыстаны не толькі для вывучэння экалагічных наступстваў чарнобыльскай бяды, але і для папаўнення колькасці рэдкіх жывёлаў. Пра гэта ішла размова на міжнароднай канферэнцыі, прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння вучонага Мікалая Цімафеева-Рэсоўскага, якая адкрылася 17 кастрычніка ў Міжнародным экалагічным універсітэце імя Андрэя Сахарава. Даклад па радыяцыйных ацэнках стану жывёльнага свету ў чарнобыльскай зоне падрыхтавалі супрацоўнікі Інстытута заалогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. У якасці прыкладу дакладчык — супрацоўнік інстытута Аляксандр Пленін — прывёў белавежскіх зубраў, інтрадуцыраваных у Палескі радыеэкалагічны запаведнік.

Маніторынг жывёльнага свету чарнобыльскай зоны, які праводзілі аўтары з 1986 года, уключаў каля 20 тысяч відаў беспазваночных жывёлаў, 224 віды птушак, якія гняздуюцца, і 78 пералётных відаў птушак. Вывучаліся таксама рэптыліі і амфібіі. Высвятляліся, у прыватнасці, уплыў радыяцыі на колькасць папуляцыяў і іхны спектр харчавання. Так, у раёне Рудага лесу адразу пасля аварыі колькасць многіх жывёлаў, напрыклад, палявой мышы, — рэзка паменшылася, паколькі атрыманыя імі радыяцыйныя дозы былі смяротныя. Не сталі выключэннем і многія віды мезафауны глебы, нягледзячы на іх высокую радыяцыйную ўстойлівасць. Як патлумачыў дакладчык, радыяцыйны ціск на мезафауну глебы адбыўся з-за таго, што тады, у канцы красавіка 1986 года, многія яе віды знаходзіліся ў стадыі лічынак.

Дакладчык распавёў таксама пра некаторыя паўторныя эфекты радыяцыйнага ўздзеяння на жывёльны свет. Так, з-за таго, што ў чарнобыльскай зоне не ўбіраўся ўраджай, моцна распаўсюдзілася мыш-палёўка; багацце ежы прывяло да росту папуляцыяў дзікоў і казуль; моцна размножыліся таксама папуляцыі каляводных жывёлаў у закінутых каналах.

***Даведка БелаПАН.*** Мікалай Уладзіміравіч Цімафееў-Рэсоўскі прызнаны адным з найбуйнейшых біёлагаў XX стагоддзя, заснавальнікам радыяцыйнай генетыкі, біягеацэналогіі і малекулярнай біялогіі. ЮНЕСКА аб'явіла 2000 год годам М.У. Цімафеева-Рэсоўскага. У 1940—1950-я гады быў рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны ў 1992 годзе. Міжнародная канферэнцыя ў Мінску 17—18 кастрычніка — адна з многіх акцыяў прызнання яго навуковых заслугаў. Імя М.У.Цімафеева-Рэсоўскага стала шырока вядомым у былым СССР пасля публікацыі ў 1989 годзе рамана Данілы Граніна «Зубр». ■

БелаПАН

**АЛІМПІЯДА**

## Стартавалі XI Паралімпійскія гульні

**Дзмітрый УЛАСАЎ**

На спартыўных арэнах Сіднея, дзе нядаўна праходзілі Гульні XXVII летняй Алімпіяды, стартавалі XI Паралімпійскія гульні. У іх возьмуць удзел каля 4 тысяч спартсменаў-інвалідаў, якія пакутуюць ад фізічных хваробаў і маюць адхіленні ў разумовым развіцці. Яны разыграюць узнагароды ў 20 відах спорту: лёгкай атлетыцы, веласпорце, футболе, тэнісе, дзюдо, плаванні, стральбе, фехтаванні, баскетболе для інвалідаў-калясачнікаў і г.д.

Беларусь на Гульнях прадстаўляюць 26 спартсменаў у чатырох відах праграмы — лёгкая і цяжкая атлетыка, плаванне і веласпорт. Капітанам каманды абраны пяціразовы чэмпіён Паралімпійскіх гульняў па лёгкай атлетыцы Алег Шэпель. Узначаліць дэлегацыю прэзідэнт беларускага Паралімпійскага камітэта Ігар Жалязоўскі. На цяперашніх Гульнях беларусы плануюць заваяваць 15—17 медалёў. Чатыры гады таму ў Атланце (ЗША) на іх рахунку было 13 узнагародаў — 3 залатыя, 3 сярэбраныя і 7 бронзавых.

Памер прэміяльных за залаты медаль роўны 7,5 тысячы долараў ЗША, за сярэбраны — 3,75 тысячы, за бронзавы — 2,8 тысячы. Аналагічныя ўзнагароджанні атрымаюць і трэнеры спартсменаў, якія вылучацца. ■

БелаПАН



● Жаночая баскетбольная каманда з ЗША

**ФУТБОЛ**

## «Славія» ўжо амаль чэмпіён

**Аляксей СТАЎСКІ**

**За чатыры туры да фінішу чэмпіянату Беларусі па футболе ўжо амаль вызначаныя пераможца. Хутчэй за ўсё ім стане каманда «Славія» з Мазыра, якая адарвалася ад бліжэйшага праследавацеля мінскага «Дынама» на шэсць ачкоў і разрыў гэты трывала захоўвае.**

Мазыране, стартуючы ў чэмпіянаце, адразу ставілі сабе мэту — здабыць залатыя ўзнагароды першынства. Фінансавае становішча клуба, які падтрымлівае галоўны спонсар «Слаўнафта», дазволіла набыць некалькі выдатных і пяток проста моцных ігракоў, дзякуючы чаму не было ніводнай гульні, дзе б мазыране выходзілі не ў лепшым складзе. Невялічкі правал «Славіі» адбыўся толькі ў сярэдзіне сезона, калі кіраўніцтва клуба вымусілі вырашыла замяніць галоўнага трэнера Аляксандра Кузняцова на югаслаўскага спецыяліста Улада Петравіча. Ігракі доўгі час не маглі перастроіцца з добра нагулянай схемы на «югаслаўскую», і з гэтай прычыны мазыране вылецелі з кубка УЕФА і згубілі некалькі важных ачкоў у чэмпіянаце Беларусі. Але зараз, здаецца, у Мазыры ўсё наладзілася, і «Славія» граміць усіх, хто трапляецца ёй пад руку.

Такім чынам, калі мазыране стануць чэмпіёнамі, то ім у наступным годзе і прабівацца ў Лігу чэмпіёнаў, дзе беларускія клубы дасюль ні разу не выступалі.

Мінскае ж «Дынама» верагодней за ўсё стане сярэбраным прызёрам і возьме старт у кубку УЕФА, што вельмі добра для такой маладой і перспектыўнай дружыны, якой зараз ёсць «Дынама». Бронза таксама амаль гарантаваная мінулагоднім чэмпіёнам — барысаўскаму клубу БАТЭ. Ім ад гэтага свеціць удзел у кубку Інтэртата. А яшчэ адзін беларускі клуб, той, які возьме ў будучым траўні кубак Беларусі, складзе кампанію мінскаму «Дынама» ў змаганні за кубак УЕФА.

Пакуль што абсалютна незразумела, што за каманды пакінуць вышэйшы дывізіён беларускага футбола. Але гэта будзе тройка клубаў з кампаніі магілёўскага «Тарпеда», слонімскага «Камунальніка», наваполацкага «Нафтана» і «Ліды». Зрэшты, з той гульнёй, што паказваюць гэтыя каманды, туды ім (у сэнсе ў першы дывізіён) і дарога! ■



Фота IREX/ProMedia

# Прямой транзит на Запад

## Ежегодно через Беларусь незаконно мигрируют на Запад около 150 тысяч человек. В нашей прекрасной стране они жить и работать не хотят

**Наталья РАДИНА**

**Беларусь в силу географического положения стала плацдармом для переправки на Запад жителей Юго-Восточной Азии: Индии, Пакистана, Афганистана, Бангладеш, Китая. По оценкам КГБ, паспортно-визовой службы МВД, комитета погранвойск и комитета по миграции министерства труда число таких нелегалов достигает 150 тысяч в год.**

### «Дорога жизни»

Поставкой дешевой рабочей силы в Германию, Бельгию и страны Скандинавии занимаются международные преступные синдикаты. Они организовали три канала нелегального перемещения людей — индусско-пакистанский, афганский и шриланкийско-бангладешский.

Чтобы перебраться из Афганистана на Запад, нужно заплатить 15 тысяч долларов. Те, кто способен на это, отправляются в далёкое путешествие. Маршрут таков: Юго-Восточная Азия – Россия – Беларусь – Польша – Германия.

Искателей лучшей жизни собирают в группы по 20-30 человек – так легче их перевозить. В каждой стране группу встречают и переправляют дальше. Путешествие занимает до полутора месяцев.

Что ждет рядового мигранта в конце пути? Чаще всего – изнурительная работа. Нелегальные мигранты – это дешевая рабочая сила, за их работу не нужно платить налоги и соцстрах. Именно поэтому на них растет спрос.

Иногда нелегальные мигранты используются в качестве наркокурьеров. Тут для организаторов двойная выгода: перевозку дорогого препарата осуществляет мигрант, который сам выкладывает кругленькую сумму за поездку. В этом году на границе с Польшей в морозильной камере автопоезда пограничники обнаружили 10 китайцев, прикрытых свиными тушами. Нелегалы везли с собой по килограмму кокаина, полученного еще в Китае.

Но обычно организаторы переселения дают подопечным строгий наказ — ни грамма белого порошка. Во-первых, те могут сбыть наркотик по дороге. В случае поимки такого торговца милицией — сбоев в механизме переправки людей не избежать. Во-вторых, поставщики «живого товара» заинтересованы в полноценных работоспособных людях, наркоманы им ни к чему.

После задержания, как правило в течение 10 дней, мигрантов депортируют на родину – в Беларуси нет фильтрационных лагерей, а минский приемник-распределитель едва вмещает соотечественников.



### Белорусское гостеприимство

В Россию «кочевники», как правило, приезжают, не нарушая закон, — по приглашению на учебу в московский вуз или по туристической визе. Попасть в Беларусь при отсутствии границы просто. А в Минске их уже ждут. Сразу заселяют в специально снятую квартиру, где нелегалы отсиживаются от 3 до 5 суток.

Хозяева квартир – обычные алкоголики. Все они, когда такие притоны «накрывает» милиция, заявляют, что «просто сдавали квартиры».

Автору этого материала удалось посмотреть видеосъемку «накрытия» одной такой квартирки. 15 испуганных индийцев лежали на полу на грязных матрасах. Среди них были не только мужчины, но и беременные женщины и дети. Хозяйка квартиры, алкоголичка и мать шестерых детей, знала только имя квартиросъемщика – Дэвид. Кто он и где его найти, она, разумеется, не ведала.

Из Минска «гостей столицы» переправляют в Польшу. Самый простой путь – через Литву. Людей привозят к белорусско-литовской границе и отправляют в соседнюю страну, где их уже ждут тамошние коллеги белорусских «специалистов по миграции». Пересечь же литовско-польскую границу – так же просто.

Прямиком из Беларуси в Польшу едут в специально сооруженных в автомашинах тайниках — отсеках шириной в 70 см. На протяжении всего пути нельзя ни лечь, ни присесть – люди едут стоя, прижатые друг к другу. Грудным детям, которые могут выдать тайник плачем, заклеивают ротики скотчем.

Как-то белорусские таможенники обнаружили в одном автопоезде такой отсек. На следующий день при более внимательном рассмотрении «фуры» они нашли второй отсек, в нем было 12 китайцев. Голодные, мучимые жаждой люди простояли в тайнике сутки. Насколько велико было их желание оказаться в Европе, если никто из них за это время не подал голоса!

Везут нелегалов и в обычных легковых машинах. На заднем сиденье «жигулей» четвертой модели при желании можно положить 6 китайцев. Без «своих людей» среди таможенников такой «паром» берега не достигнет. Иначе говоря, без подкупа должностных лиц «экспедиторам» не обойтись.

При соответствующей щедрости таможенник «не заметит» в микроавтобусе десяток индийцев. «Слепота» стала бизнесом и для некоторых участковых милиционеров. Поскольку в обязанности любого участкового входит контроль за местными тунеядцами, то о жизни в их квартирах он более или менее информирован.

### Единоличники

Свой путь мигранты если и не выжигают огнем, то и бесследно не проходят. Беларусь, Польшу и Германию их беспрерывный поток «награждает» ростом преступности, вспышками туберкулеза, контрабандными наркотиками и оружием.

По логике «потерпевшие» страны давно должны были бы объединить усилия и принять законы о высылке нелегальных мигрантов. Также справедливо было бы поделить затраты на депортацию задержанных нелегалов (возвращение на родину одного нелегального мигранта стоит от 500 долларов).

Но пока в этой сфере общего языка нет. Польша, например, просит договор, который позволит приехавших через Беларусь в Польшу индусов и пакистанцев депортировать не в Пакистан или Индию, а обратно в Беларусь.

Иностранные посольства в Беларуси тратить деньги на депортацию своих сограждан тоже не желают. Только посольство Индии согласилось оплачивать обратный путь тех индийцев, кто явился к ним с повинной. Но совестливых, похоже, немного. ■

# Пад адной вокладкай

**Канстанцін СКУРАТОВІЧ**

Ёсць такая грамадская арганізацыя «Беларуская перспектыва», у якой працуюць вельмі паважаныя і шаноўныя людзі. Іх намаганнямі ладзяцца чытанні і семінары, пераважна для моладзі, у розных кутках Беларусі, выдаецца інфармацыйны бюлетэнь, у якім можна пачытаць многа цікавага як пра саму «Беларускую перспектыву», так і ўвогуле пра тое, што чакае беларусаў у будучыні па меркаванні адбітных тутэйшых дзеячаў. Скажаце, што такіх арганізацыяў мноства, што ўсе яны заяўляюць прэтэнзіі на ролю аракулаў? Пагодзімся з гэтым, але адзначым, што ў «Беларускай перспектывы» ёсць і свае, адметныя рысы. Прынамсі, добра наладжаныя кантакты з беларускімі звязамі на Беласточчыне. Менавіта ў Беластоку, у Цэнтры грамадзянскай адукацыі Польшча—Беларусь праходзіць значная частка семінараў і сустрэч беларускай моладзі з аднагодкамі, з прадстаўнікамі беларускай дыяспары ў братняй краіне, з яе палітыкамі і грамадскімі дзеячамі.

Адным з вынікаў гэтага супрацоўніцтва стала выданне даведніка «*Kto jest kim w Bialorusi*» («Хто ёсць хто ў Беларусі»), у якім змешчаныя звесткі пра 450 асобаў, якія тым ці іншым чынам удзельнічаючых у жыцці нашай краіны. Суайчыннікі пра плён працы гэтых дзеячаў добра ведаюць, а вось у Польшчы мала хто. Прынамсі, пра тое, што беларуская «яблычніца» Вольга Абрамава (аўтабіяграфічнай даведкай пра яе пачынаецца кніга) ужо падчас перабудовы надрукавала навуковую працу пад назвай «Канстытуцыя СССР — увасабленне ленінской нацыянальнай палітыкі». А ці не цікава будзе польскаму беларусу даведацца пра тое, што Аляксандр Лукашэнка любіць усё рабіць двойчы. Так, ён два разы служыў у войску (1975-1977; 1980-1982), што ён і старшыня Нацыянальнага алімпійскага камітэта, і ганаровы акадэмік. Што ён ужо двойчы «прэзідэнт»... Можа на гэтым двухсерыйнасць і скончыцца?

А ці не меней цікава, што памочнік Лукашэнкі палкоўнік запасу Сяргей Посахаў напісаў каля 200 газетных артыкулаў, дзве манаграфіі ды доктарскую дысертацыю на тэму «Выбарчыя тэхналогіі і фармаванне вышэйшых органаў улады ў Рэспубліцы Беларусь». Але самае цікавае ў тым, што, як пададзена ў кніжцы, пасля ўсяго гэтага Сяргей Аляксеевіч лічыць сябе праваслаўным вернікам.

Есць у даведніку звесткі і пра іншыя, не такія адыёзныя




фігуры. Уласна кажучы, яны добра спачуваюцца пад агульнай вокладкай і маўчаць нема, пакуль не адгорнеш старонку на тую ці іншую літару. А вось каб сабраць іх у адно нейкае памяшканне, то без вялікага вэрхалу ці нават бойкі мусіць бы не абыйшлося. А раз так, то наш лозунг «Жыве Беларусь!» мае пад сабой усе падставы. ■

Галоўны рэдактар
Павел ЖУК

© НАША СВАБОДА. Спасылка на газету НАША СВАБОДА абавязковая. Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў, публікаваць артыкулы дзеля палемікі.
Адрас: г.Мінск, пр-т газеты «Известия», 8-173. Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1289. Выдаецца з 25 лютага 2000 г. Заснавальнік Зміцер Жук.
Выдавец — рэдакцыя газеты НАША СВАБОДА. E-mail: NPSvaboda@irex.minsk.by Надрукавана ў друкарні УП «Мэджык»
г. Мінск, ул. Кнорына, 50. Заказ №791 Нумар падпісаны ў друк 19/10/2000 (18.00) Наклад — 9.260